Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

6 МАЯ 2017 г. СУБОТА № 85 (28449)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ПОМНІМ СЛАЎНЫ ПАДЗВІГ

Дарагія суайчыннікі!
Ад усёй душы віншую вас з Днём Перамогі.

У бязлітасных баях Вялікай Айчыннай вайны 72 гады таму савецкімі войскамі і іх саюзнікамі быў разгромлены нацызм, спынена яго бесчалавечная агрэсія. У беларускіх сем'ях свята шануюць ратны подзвіг сваіх продкаў, як бясцэнныя рэліквіі захоўваюць іх ордэны, медалі, фатаграфіі і пісьмы з фронту.

Дарагія ветэраны, пашана вам і слава! Мы будзем вечна помніць імёны мільёнаў байцоў і працаўнікоў тылу, якія адстаялі свабоду любімай Радзімы!

Бяспрыкладны гераізм савецкага народа натхняе цяперашняе пакаленне нашых суайчыннікаў на стваральную працу, а памяць аб Вялікай Перамозе кансалідуе грамадства для пераадолення глабальных выклікаў і пагроз.

У гэта сапраўды ўсенароднае свята жадаю ўсім здароўя, аптымізму, дабрабыту і мірнага неба над роднай Беларуссю.

Прэзідэнт
Рэспублікі Беларусь
Аляксандр ЛУКАШЭНКА

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр ШУМІЛІН, старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях

«Рынак інтэлектуальнай уласнасці ў нашай краіне сёння дынамічна развіваецца. Мы разумеем, што развіваць навуку, ствараць інавацыі і будаваць эканоміку ведаў немагчыма без абароны інтэлектуальнай уласнасці. Тым больш што кошт аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці расце ва ўсім свеце. Наш унутраны рынак невялікі, таму неабходны выхад на міжнародны, і мы актыўна гэтым займаемся. Штомесяц да сайта нашага патэнтнага органа звяртаюцца каля 25 тысяч чалавек з 50 краін. У 2016 годзе было заключана больш за 750 дагавораў аб перадачы правоў на аб'екты прамысловай уласнасці: іх колькасць павялічылася на 20%. Расце і колькасць заявак на выдачу патэнтаў».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 06.05.2017 г.

Долар ЗША	1,8934	▲
Еўра	2,0756	▲
Рас. руб.	0,0323	▼
Укр. грыўня	0,0714	▲

ISSN 1990 - 763X

■ Салдаты Перамогі

ГАЛОЎНАЯ ЎЗНАГАРОДА

Медаль «За адвагу» знайшла свайго героя больш чым праз 70 гадоў

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Гэтую высокую салдацкую ўзнагароду, якую па негалосным правіле ўручалі толькі адчайным смельчакам, ветэран Вялікай Айчыннай вайны Барыс МУЗАЛЕЎСКІ *(на фота)* павінен быў атрымаць у сакавіку 1945-га. Але з-за напружанасці баёў было не да цырымоній... Літаральна за месяц да гэтага загад аб прысваенні яму медаля «За адвагу» ўжо быў падпісаны. І памылкі тут няма: з інтэрвалам літаральна ў месяц подзвігі малодшага сяржанта Музалеўскага на шляху да Берліна двойчы былі адзначаны найбольш ганаровай савецкай узнагародай сярод чырвонаармейцаў.

«АДПЛАЦІМ СПАЎНА...»

Калі зімой 1942 года немцы спалілі ўсе хаты ў родным сяле Шахаўское, што непадалёк ад Валакаламска, гэтым самым пакінуўшы жанчын з дзецьмі на вуліцы ў 30-градусны мароз, шаснаццацігадовы Барыс марыў толькі аб адным: адплаціць гітлераўцам той жа манетай. Але вяршыць расправу над мірнымі жыхарамі — не ў духу савецкага салдата. Вызваляючы Усходнюю Прусію і Германію ад фашыстаў, чырвонаармеец Барыс Музалеўскі помсціў ворагу толькі на полі бою.

У Чырвоную Армію яго прызвалі ў 1943 годзе, Барысу толькі споўнілася 17 гадоў. Першы год службы прайшоў у навучальным палку ў Сонечнагорску. У пачатку снежня 1944-га полк расфарміравалі, а асабовы склад адправілі ў Алабіна, адкуль эшалонам — на фронт.

— Ноччу прыбылі ў Беласток і адразу ж трапілі пад бамбёжку, — успамінае Барыс Мікалаевіч. — Выгрузіліся і пешшу ўсю ноч ішлі туды, дзе размяшчалася 47-я асобная Духаўшчынская механізаваная брыгада. Нам выдалі новыя аўтаматы, да іх па адным дыску і па два ражкі, патроны, дзве гранаты Ф-1, сухі паёк. Размеркавалі па батальёнах, і ўжо вечарам мы ўступілі ў бой. Кожны афіцэр і салдат думаў аб тым, што мы спаўна адплацім немцам за ўсе злачынствы, якія яны ўчынілі на нашай зямлі.

Праз шмат гадоў ва ўзнагародных лістах на ветэрана нашчадкі прачытаюць: «у баі ў раёне вёскі Карвіндэн таварыш Музалеўскі, выдатны стралок, трапным агнём не даваў немцам магчымасці выходзіць з-за ўкрыцця, забіў пры гэтым 5 немцаў», «у баі за горад Фрацэнбург са сваім аддзяленнем уварваўся ў траншэі праціўніка і ў рукапашнай сутычцы асабіста знішчыў двух гітлераўцаў».

— Ніхто з нас тады не думаў аб узнагародах, — прызнаецца ўдзельнік тых падзей. — Думалі, як бы ворага перамагчы ды каб жывымі застацца...

СТАР. 4

■ Разумныя грошы

Пабачыць замор'е і з грашыма застацца

Слушныя парады экспертаў аб выкарыстанні «пластыку» за мяжой

Недзе праз месяц пачынаецца сезон адпачынкаў, а значыць, пытанне аб выбары плацежнай карткі для паездкі за мяжу становіцца актуальным як ніколі. Сёння нам спецыялісты прэс-службы нацыянальнай сістэмы «БЕЛКАРТ» раскажуць пра тое, якой павінна быць такая картка, ці трэба браць з сабой у адпачынак наяўныя грошы і як пазбегнуць фінансавых непрыемнасцяў у падарожжы.

Куды едзем і навошта

Першае, што трэба спачатку зрабіць, — высветліць, як ідуць справы з безнаяўнымі разлікамі ў той краіне, якую вы збіраецеся наведаць. Наколькі развіта картачная інфраструктура, ці шмат там банкаматаў, ці вялікія рызыкі ашуканскіх аперацый?

На самай справе і Еўропа, і Азія вельмі розныя. Напрыклад, у Сінгапуры не ўзнікне праблем з безнаяўнымі разлікамі, аднак у многіх іншых азіяцкіх краінах далёка не ўсюды ў вас прымуць да аплаты картку, асабліва не ў турыстычных зонах. У Швецыі доля безнаяўных разлікаў вельмі высокая, краіна плануе наогул адмовіцца ад гатоўкі ў найбліжэйшай будучыні. У той час як нават у Маскве картку могуць прыняць далёка не ў любой краме.

Невялікую кансультацыю можна атрымаць у вашым банку, асабліва калі гаворка ідзе пра папулярныя для беларускіх турыстаў напрамкі. Пры набыцці пуцёўкі ў турыстычным агенцтве актыўна задавайце пытанні іх спецыялісту: напэўна, ён таксама нешта падкажа. Аднак самы правільны і практычна бяспройгрышны варыянт — самастойна пашукаць інфармацыю на турыстычных форумах. У свеце шмат розных краін, і ў кожнай з іх свае асаблівасці. Не варта разлічваць, што банкаўскія работнікі цалкам валодаюць інфармацыяй аб картачным рынку ў той ці іншай краіне. Па вялікім рахунку, яны і не абавязаны гэта ведаць.

СТАР. 6

НАША АГУЛЬНАЕ СВЯТА

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка напярэдадні 72-й гадавіны Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне накіраваў віншавальныя пасланні замежным лідарам, выдатным дзяржаўным дзеячам і кіраўнікам інтэграцыйных аб'яднанняў.

«Гэта свята нагадвае нам аб сумесным шляху, пройдзеным брацкімі народамі, аб адзінстве гісторыі і духоўнага вопыту, перамогах і перажытых выпрабаваннях, — гаворыцца ў віншавальным пасланні беларускага лідара Прэзідэнту Расіі Уладзіміру Пуціну. — Сімвалічна, што беларусы і расіяне беражліва захоўваюць памяць аб вялікім подзвігу продкаў, перадаюць з пакалення ў пакаленне гістарычную праўду аб той страшнай вайне і разам будуюць будучыню».

Аляксандр Лукашэнка накіраваў віншавальныя пасланні таксама Прэзідэнту Азербайджана Ільхаму Аліеву, Прэзідэнту Арменіі Сержу Саргсяну, Прэзідэнту Казахстана Нурсултану Назарбаеву, Прэзідэнту Кыргызстана Алмазбеку Атамбаеву, Прэзідэнту Малдовы Ігару Дадону, Прэзідэнту Таджыкістана Эмамалі Рахмону, Прэзідэнту Туркменістана Гурбангулы Бердымухамедаву, Прэзідэнту Узбекістана Шаўкату Мірзіёеву, Прэзідэнту Украіны Пятру Парашэнку і Прэзідэнту Грузіі Гіоргію Маргвелашвілі. Акрамя таго, кіраўнік беларускай дзяржавы павіншаваў Старшыню Урада Расійскай Федэрацыі Дзмітрыя Мядзведзева, Старшыню Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі Валянціну Мацвіенку, Старшыню Дзяржаўнай Думы Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі Вячаслава Валодзіна, а таксама Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Кірыла, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта.

Віншавальныя пасланні з Днём Перамогі накіраваны таксама Старшыні Выканаўчага камітэта — Выканаўчаму сакратару Садружнасці Незалежных Дзяржаў Сяргею Лебедзеву, дзяржаўнаму сакратару Саюзнай дзяржавы Рыгору Рапоту, Старшыні Калегіі Еўразійскай эканамічнай камісіі Тыграну Саркісяну.

НА ХВАЛЯХ ПАМЯЦІ — ДЛЯ БУДУЧЫНІ

Папяровыя караблікі з пажаданнямі ветэранаў запусцілі каля фантана студэнты Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Свята 9 мая асаблівае для людзей усіх узростаў, а ў сучаснай моладзі пакуль ёсць магчымасць пачуць гісторыю з вуснаў тых, хто яе ствараў, адчуць, што такое вайна, які боль яна нясе. Такую думку выказала **Наталля КЛІМОВІЧ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы,** на адкрыцці ўрачыстага мерапрыемства ў Акадэміі кіравання, прысвечанага Дню Перамогі. **Дзмітрый ШАЎЦОЎ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах,** таксама адзначыў, як важны вынік сустрэчы ўдзельнікаў вайны і тых, хто толькі ступіў у дарослае жыццё:

— Гэта свята жыццёва неабходнае для краіны. Наша моладзь інтэлектуальная, адукаваная, цікавая. Людзі новага пакалення жывуць ужо ў іншым вымярэнні. І тое, што хлопцы і дзяўчаты захоўваюць успаміны, шукаюць звесткі і рэканструююць падзеі — гэта ганарова, важна і вельмі здорава, бо пакуль мы аддаём павагу ветэранам і разумеем, якой цаной быў дасягнуты мір, можна спадзявацца, што цяперашнія і будучыя жыхары краіны падтрымаюць гэты спакой, не дазволяць канфрантацый ні ўнутры Беларусі, ні на знешнепалітычнай арэне.

Рэктар Акадэміі кіравання Марат ЖЫЛІНСКІ таксама павіншаваў усіх, хто сабраўся. Па яго словах, Вялікая Айчынная вайна названа так з-за сутнасці перамогі нашых салдат. Не было б яе — напэўна, не існавала б нават пытання пра беларускую нацыю.

— Наша краіна адна з нешматлікіх у свеце, якія адзначаюць Дзень Перамогі і Дзень Незалежнасці як амаль адно свята, агульнае для дзяржавы, — падвёў вынік рэктар.

Акрамя святочнага канцэрта і акцыі «Па хвалях Памяці» каля фантана, прысутныя маглі пабачыць выстаўку ваеннай тэхнікі, ролікі з конкурсу інтэрактыўных праектаў «Святло Вялікай Перамогі» і пакаштаваць гарачай салдацкай кашы.

Рагнеда ЮРГЕЛЬ. *yurgel@zviazda.by*

Вас выслухае міністр

На афіцыйным сайце Савета Міністраў апублікаваны графік правядзення прамых тэлефонных ліній кіраўнікамі дзяржорганаў у маі.

6 мая прамую тэлефонную лінію правядуць міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ, міністр абароны Андрэй РАЎКОЎ, міністр сувязі і інфарматызацыі Сяргей ПАПКОЎ, міністр юстыцыі Алег СЛІЖЭЎСКІ, старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Аляксандр ШУМІЛІН.

13 мая на прамой тэлефоннай сувязі з насельніцтвам будуць міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй КАЎХУТА і старшыня Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Анатоль ЛАПО.

20 мая прамую тэлефонную лінію правядуць міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Аляксандр ЦЕРАХАЎ, міністр замежных спраў Уладзімір МАКЕЙ, міністр культуры Барыс СВЯТЛОЎ, старшыня Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Андрэй ГАЕЎ.

27 мая можна будзе звярнуцца з пытаннем да міністра антыманапольнага рэгулявання і гандлю Уладзіміра КАЛТОВІЧА, міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Леаніда ЗАЙЦА, міністра фінансаў Уладзіміра АМАРЫНА.

Акрамя кіраўнікоў дзяржорганаў, прамыя тэлефонныя лініі правядуць іх намеснікі. Час правядзення прамых тэлефонных ліній — з 09.00 да 12.00. Нумары можна ўдакладніць на афіцыйным сайце ўрада.

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

■ Парламенцкі дзённік

ПРАГМАТЫЧНЫ ІНТАРЭС

Як сесія ПА АБСЕ ў Мінску дапаможа развіццю эканамічных сувязяў Беларусі і ЕС

Літаральна праз два месяцы наша краіна акажацца ў цэнтры ўвагі не толькі рэгіёна, але і свету — у Мінску адбудзецца 26-я сесія Парламенцкай асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (ПА АБСЕ). Пра тое, чаго чакае ад мерапрыемства наша дзяржава і як ідзе арганізацыйная падрыхтоўка да сесіі, журналістам расказаў Баляслаў ПІРШТУК, намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі.

Палітыка і бізнес

Нядаўна віцэ-спікер ніжняй палаты беларускага парламента прыняў удзел у пасяджэнні Бюро ПА АБСЕ, якое адбылося ў Капенгагене (Каралеўства Данія). Па яго словах, да нашай дзяржавы як да арганізатара пытанняў там няма. Відаць, не сумняваюцца, што ўсё будзе на найлепшым узроўні:

— Нам, па вялікім рахунку, ніякіх пытанняў не задаюць. Мы працуем у рамках той праграмы, якая была зацверджана. Спадарыня Мутонен (старшыня ПА АБСЕ. — **«Зв.»**) падзялілася ўражаннямі ад Беларусі — яна была ў нас у сакавіку. Крысцін Мутонен сказала, што ўпэўнена: беларускія ўлады вельмі зацікаўленыя і вельмі адказна ставяцца да будучага мерапрыемства.

Каментуючы пытанне «Звязды» пра тое, чым Беларусь можа здзівіць замежных гасцей падчас сесіі, Баляслаў Піршток сказаў:

— Складана сёння многіх парламентарыяў здзівіць нечым. Бо яны вельмі мабільныя, перамяшчаюцца па ўсім свеце: прадстаўніцтва АБСЕ ўключае ў свой склад 57 краін. Паступова яны вось так аб'язджаюць увесь свет. Але да нас падыходзяць розныя дэлегацыі, нешта ўдакладняюць. Многія ведаюць нашы брэнды, нашы моцныя бакі, многія цікавяцца ў тым ліку і тэхналогіямі. Яны знаёмыя з высокім узроўнем нашай ІТ-індустрыі, нашы дасягненні ў медыцыне таксама не сакрэт. Не кажу ўжо пра нашы традыцыйныя галіны рэальнага сектара. Многія, асабліва нашы постсавецкія рэспублікі — у тым ліку прыбалтыйскія краіны, цікавяцца беларускім вопытам у галіне сельскай гаспадаркі, прыходам сюды бізнесу.

Так, расказаў парламентарый, некаторыя чулі пра тое, што ў нас ёсць Кітайска-беларускі індустрыяльны парк, які прадугледжвае для сваіх рэзідэнтаў вялікія прэферэнцыі. Швецыю ж, напрыклад, цікавіць усё, што звязана з дрэваапрацоўкай, лесам.

— Шведскія парламентарыі папрасілі, каб у рамках сесіі была магчымасць прывезці з сабой прадстаўнікоў дзелавых колаў і каб мы паказалі нашы патэнцыяльныя магчымасці, — расказаў віцэ-спікер. — Мы не хаваем, што вельмі зацікаўленыя ў росце інвестыцый у нашай краіне. Сустракаючыся з нашымі калегамі на гэтых пляцоўках, безумоўна, абмяркоўваем у тым ліку нашы прыярытэты, прэферэнцыі, эканамічныя зоны.

Заваяваць перспектыўны рынак

— Парламентарыі велізарную ўвагу ўдзяляюць эканамічнаму супрацоўніцтву, — яшчэ раз падкрэсліў віцэ-спікер Палаты прадстаўнікоў. — Таму з кіраўніцтвам ПА АБСЕ, прадстаўнікамі шэрагу нацыянальных дэлегацый абмеркаваны перспектывы гандлёва-эканамічнага і інвестыцыйнага супрацоўніцтва. Нядаўна мы сустракаліся з нашымі эстонскімі калегамі на чале з кіраўніком групы па супрацоўніцтве з беларускім парламентам Валерыем Корбам. Тут таксама была пацверджана ўзаемная зацікаўленасць у наладжванні эканамічных сувязяў. Мы не хаваем, што вельмі зацікаўленыя ў больш цесным супрацоўніцтве з краінамі Еўрапейскага саюза.

Выхад на гэты рынак для Беларусі — важны кірунак. Як вядома, пастаўлена задача — 30% нашага знешняга таварабароту павінна быць з ЕС. Гэта мэта павінна быць выканана да канца пяцігодкі.

— Мы таксама над гэтай тэмай, паралельна з выканаўчай уладай, працуем, — заявіў Баляслаў Піршток. — У цэлым жа правядзенне сесіі Парламенцкай асамблеі АБСЕ ў Мінску дазволіць нам прэзентаваць магчымасці нашай краіны, у тым ліку як важнай міжнароднай перагаворнай пляцоўкі. Менавіта беларускі бок сфармуляваў тэму сесіі, з якой пагадзіліся нашы калегі: «Умацаванне ўзаемнага даверу і супрацоўніцтва ў імя міру і працвітання ў рэгіёне АБСЕ».

З перакладамі праблем не будзе

Ужо на гэтым тыдні пачынаецца візіт дэлегацыі Міжнароднага сакратарыята ПА АБСЕ ў нашу краіну. Адпаведна, арганізацыйныя пытанні паступова вырашаюцца. Адказваючы на пытанне карэспандэнта «Звязды» пра тое, дзе адбудуцца галоўныя мерапрыемствы сесіі, Баляслаў Піршток паведаміў:

— Афіцыйнае адкрыццё будзе па праспекце Пераможцаў, 14. Асноўныя мерапрыемствы — пасяджэнні камітэтаў — пройдуць у «Прэзідэнт-атэлі». Пражываць нашы госці будуць у атэлях, якія яны самі падабралі. За харчаванне і пражыванне плацяць самі замежнікі.

— Мы будзем выкарыстоўваць шмат транспарту для перамяшчэння гасцей да месцаў правядзення мерапрыемстваў, — расказаў віцэ-спікер Палаты прадстаўнікоў, — будзем арганізоўваць у тым ліку і культурную праграму: асноўнае мерапрыемства пройдзе ў Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета. Будуць прапаноўвацца выязныя экскурсіі, музеі, гістарычныя аб'екты...

— Да нас прыедуць госці з самых розных краін. Як будзе вырашацца моўнае пытанне?

— Што да перакладаў, то ёсць міжнародны стандарт: павінна быць шэсць замежных моў, — растлумачыў Баляслаў Піршток. — Мы ўсе гэтыя стандарты прынялі. Да гэтага часу мы рыхтуем усё неабходнае абсталяванне. Павінна быць надзейная сувязь, трансляцыя, умовы для журналістаў... У нас ёсць вялікая група валанцёраў з веданнем замежных моў, якія будуць працаваць з моманту прыезду дэлегацый, ад сустрэчы ў аэрапортах і да месца размяшчэння, іх суправаджэння. Валанцёры будуць ва ўсіх гасцініцах, дзе размесцяцца замежныя парламентарыі.

Надзея ЮШКЕВІЧ.
yushkevich@zviazda.by

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Пхеньян абвінаваціў ЗША і Паўднёвую Карэю ў падрыхтоўцы тэракта супраць кіраўніцтва КНДР

Як заявілі ў Міністэрстве дзяржаўнай бяспекі КНДР, тэракт планавалася здзейсніць з выкарыстаннем «біяхімічнай субстанцыі».

Па даных Міністэрства дзяржбяспекі, ЦРУ і НРС Паўднёвай Карэі «ўкаранілі на тэрыторыю КНДР злачынную групу, якая планавала здзейсніць тэрарыстычны акт у дачыненні да вышэйшага кіраўніцтва краіны, выкарыстоўваючы біяхімічную субстанцыю». З гэтай мэтай амерыканскія і паўднёвакарэйскія спецслужбы, адзначаецца ў заяве ведамства, «падкупілі ідэалагічна няўстойлівага грамадзяніна КНДР па прозвішчы Кім, ператварыўшы яго ў тэрарыста, настроенага супраць вышэйшых кіраўнікоў краіны». Ён асеў у Пхеньяне яшчэ ў 2016 годзе. Замах, мяркуючы па заяве Міністэрства дзяржбяспекі, планавалася ажыццявіць у Кумсусанскім палацы, дзе знаходзяцца пахавальні Кім Ір Сена і Кім Чэн Іра, або падчас ваеннага парада.

Але «ўсе агенты Цэнтральнага разведвальнага ўпраўлення ЗША і Нацыянальнай разведвальнай службы Паўднёвай Карэі будуць знішчаны ў КНДР да апошняга чалавека», адзначаецца ў заяве Міністэрства дзяржаўнай бяспекі КНДР.

Хамід Карзай: ІД — гэта спараджэнне і інструмент ЗША

Тэрарыстычная групоўка «Ісламская дзяржава» з'яўляецца спараджэннем і інструментам ЗША, якія выкарыстоўваюць тэрыторыю Афганістана для выпрабавання сваіх узбраенняў. З такім абвінавачваннем выступіў у інтэрв'ю тэлеканалу Fox News былы афганскі прэзідэнт Хамід Карзай.

«ІД з'яўляецца прадуктам ЗША, — адзначыў ён. — Гэтая арганізацыя відавочна замежнага паходжання, яна з'явілася ў 2015 годзе падчас ваеннай прысутнасці Злучаных Штатаў».

Ён лічыць, што менавіта «ЗША варта растлумачыць» рэгулярныя палёты верталётаў без апазнавальных знакаў, якія скідаюць грузы ў кантраляваных тэрарыстамі зонах на мяжы Афганістана і Пакістана.

Стывен Хокінг назваў штучны інтэлект «магчымым забойцам чалавечай цывілізацыі»

Штучны інтэлект у будучыні можа стаць прычынай гібелі чалавечай цывілізацыі. Пра гэта заявіў вядомы брытанскі навуковец Стывен Хокінг у ходзе відэаканферэнцыі ў кітайскай сталіцы, якая адбылася ў межах Глабальнай канферэнцыі мабільнага інтэрнэту.

«Развіццё штучнага інтэлекту можа стаць як найбольш пазітыўным, так і самым страшным фактарам для чалавецтва. Мы павінны ўсведамляць небяспеку, якую ён сабой уяўляе», — падкрэсліў ён.

Па словах Хокінга, найноўшыя тэхналогіі могуць прывесці да дэградацыі чалавека, зрабіць яго зусім бездапаможным перад тварам прыроды. Ён дадаў, што ва ўмовах натуральнай эвалюцыі і барацьбы за выжыванне гэта ёсць пагібель. У той жа час вучоны адзначыў, што пры ўмелым падыходзе штучны інтэлект здольны вырашыць большасць праблем, якія існуюць у свеце.

Прыходзьце загадзя

Гулянні на Дзень Перамогі заўсёды збіраюць па ўсёй краіне не адну сотню тысяч чалавек. Але каму свята, а каму — і праца. На плечы ратавальнікаў, міліцыянераў і ўрачоў кладзецца дадатковы цяжар. Як жа правесці свята бяспечна?

Самыя вялікія мерапрыемствы запланаваны ў Мінску ў раёне плошчы Перамогі. Там з'явяцца 8 КПП і 18 пунктаў пропуску. У вячэрні час іх колькасць узрасце да 13 і 55 адпаведна. Падчас святкаванняў выхад са станцыі метро да абеліска будзе перакрыты, а калі народу збярэцца вельмі шмат, то цягнікі пойдуць на прагон.

— На прылеглых да месцаў масавых гулянняў вуліцах будзе абмежавана месца для прыпынку і стаянкі транспартных сродкаў, — гаворыць **старшы інспектар па асобых даручэннях УДАІ МУС Станіслаў САЛАВЕЙ.** — Таму калі хтосьці вырашыць дабрацца да святочных пляцовак за рулём, то прыязджаць трэба загадзя, каб прыпаркаваць аўто і дабрацца туды пешшу.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
schklennik@zviazda.by

ДЗЯЛІЦЦА, РАЗВОДЗІЦЦА І КУПЛЯЦЬ...

На стэндзе «Звязды» натарыус дапамагала грамадзянам вырашыць іх праблемы

Як набыць ва ўласнасць зямлю, куды і калі звяртацца, каб атрымаць спадчыну, ці можна падарыць сваю маёмасць, каб яна трапіла ў тыя рукі, у якіх яе хоча бачыць спадчынадавец? Такія пытанні на стэндзе «Звязды» задавалі натарыусу наведвальнікі выстаўкі «СМІ ў Беларусі», якім пашанцавала атрымаць бясплатную кансультацыю.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Надзея Шупенька, натарыус Мінскай абласной натарыяльнай акругі, расказала, што найчасцей беларусы сапраўды цікавяцца перш за ўсё наследаваннем і падзелам маёмасці. Пры гэтым іх хвалююць як пытанні, якія можна вырашыць згодна з законам, так і тыя, што дыктуе ім іх светапогляд.

— Здараецца, адзін з нашчадкаў збіраецца звяртацца ў суд з іскам, бо лічыць сваяка непрыстойным чалавекам, які не даглядаў бацькоў, а цяпер толькі з'явіўся на падзел. Калі ён напіша нам заяву, справу можна спыніць на 10 дзён. Тым не менш, калі пры падзеле маёмасці нашчадкі не могуць дамовіцца паміж сабой, натарыус можа толькі адкласці натарыяльнае дзеянне на пэўны час, але вырашыць сваю праблему яны могуць толькі праз суд.

Усё часцей да натарыуса звяртаюцца і за шлюбнымі дагаворамі, якія пакрысе ўваходзяць у Беларусі ў моду, дадала натарыус.

— У маёй практыцы грамадзяне, якія збіраюцца пабрацца шлюбам і задумваюцца пра сваю ўласнасць, стараюцца пакінуць права на яе за сабой. А вось тое, што будзе набыта сумесна пасля, ужо дзяліць пароўну. Здараецца, прыходзяць складаць тэрміновыя дагаворы, якія патрэбны літаральна заўтра. Гэта дакладна сведчыць, што людзі разводзяцца і не хочуць дзяліць маёмасць у судзе. Яны вырашаюць усе моманты з натарыусам і з зарэгістраваным дагаворам пасля спакойна ідуць скасоўваць шлюб.

Атрымаць бясплатную кансультацыю некаторыя пастараліся не толькі для сябе, а і для іншых.

— Я пыталася, ці можа мой сусед пасля смерці жонкі і сына аформіць на сябе кватэру, машыну і гараж, якія перайшлі яму ў спадчыну. Аказалася — так зрабіць нельга, бо яшчэ жывая маці яго жонкі, якая таксама мае правы на ўсё гэта. А мяне асабіста цікавіла, ці магу я стаць адзінай уласніцай дачы майго бацькі і не дзяліцца са сваім зводным братам. Аказалася, што хоць яна і была пабудавана ў часы, калі ў таты была першая сям'я (наша), аднак калі не будзе завяшчання, то ўся маёмасць будзе дзяліцца паміж усімі прэтэндэнтамі на спадчыну. Натарыус прапанавала аформіць дароўны дакумент — цяпер буду размаўляць з бацькамі, — падзялілася наша чытачка Таццяна.

— Трапіць да натарыуса даволі цяжка. Трэба знайсці не толькі грошы, але і час. А тут я за некалькі хвілін зняла цяжар з душы. Бо расказала сваю сітуацыю, а натарыус сказала, што пытанне будзе вырашана на маю карысць. Цяпер я магу не хвалявацца і не буду мітусіцца, спрабуючы нешта зрабіць. Так што для мяне такая акцыя сталася вельмі карыснай, — падзякавала за арганізацыю Валянціна.

Ірына СІДАРОК,
sidarok@zviazda.by

■ Ведай нашых!

Дарослая ўзнагарода — маладзёжнаму дадатку

Учора падчас XXI Міжнароднай выстаўкі «СМІ ў Беларусі» былі падведзены вынікі нацыянальнага конкурсу сродкаў масавай інфармацыі «Залатая ліцера» за 2016 год. У намінацыі «Найлепшыя матэрыялы маладзёжнай, дзіцяча-юнацкай тэматыкі» галоўную ўзнагароду атрымаў маладзёжны дадатак газеты «Звязда» — «Чырвонка. Чырвоная змена».

Галоўны яе дэвіз — маладыя пішуць для маладых і пра маладых. Гэта азначае, што практычна ўсе аўтары — або штатныя маладыя спецыялісты-журналісты, або студэнты, або школьнікі. Па сутнасці, маладзёжны дадатак з'яўляецца творчай пляцоўкай для самавыяўлення моладзі.

«Звязда» таксама стала лаўрэатам прэміі ў намінацыях «Найлепшыя матэрыялы грамадска-палітычнай тэматыкі», дадатак «Союз-Евразия» атрымаў дыплом лаўрэата ў намінацыі «Найлепшыя матэрыялы эканамічнай тэматыкі». А ўласны карэспандэнт «Звязды» па Магілёўскай вобласці Нэлі Зігуля стала лаўрэатам у намінацыі «Найлепшы рэпарцёр».

■ Нябесная канцылярыя

З ПАНЯДЗЕЛКА ІЗНОЎ ПАХАЛАДАЕ

Калі ў сярэдзіне тыдня надвор'е палепшылася, а ў найбліжэйшыя дні тэмпературны фон наблізіцца да кліматычнай нормы, то гэта не надоўга. У панядзелак да нас з поўначы Еўропы завітае чарговая хваля холаду, паведамляе намеснік начальніка службы метэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Святлана РЫБАКОВА.

Сапраўды цёпла і без ападкаў прагназуецца ў суботу. Надвор'е пачне мяняцца ў другой палове дня ў нядзелю. Франтальны раздзел, які перамяшчаецца з поўдня Польшчы, прынясе да нас чарговую порцыю вільгаці. Таму ўначы ў асобных раёнах, а раніцай і ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 5—12 цяпла, удзень — 9—16 градусаў вышэй за нуль. Па поўдні краіны будзе яшчэ цёпла, калі максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе ад 17 да 22 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у панядзелак удзень на тэрыторыю Беларусі пачне паступаць халоднае паветра з поўначы Еўропы. Уначы па паўднёвай частцы краіны пройдуць дажджы, у асобных раёнах дажджы моцныя. Мінімальная тэмпература паветра ўначы складзе 1—8 цяпла, а па поўначы пры праясненнях чакаюцца нават замаразкі да нуля — мінус 2 градусаў. Удзень будзе ад плюс 7 да плюс 14 градусаў. У аўторак чакаецца няўстойлівае халоднае надвор'е. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—6 цяпла, пры праясненнях — да мінус 3 градусаў. Удзень прагназуецца ўсяго ад 2 да 9 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

■ Прыёмная кампанія — 2017

ВЫШЭЙШАЯ АДУКАЦЫЯ — БЕЗ ЗДАЧЫ ЦТ

Міністэрства адукацыі вызначыла пералік спецыяльнасцяў сярэдняй спецыяльнай адукацыі, навучальныя планы якіх інтэграваныя з навучальнымі планамі першай ступені вышэйшай школы.

Іх выпускнікі маюць права атрымліваць вышэйшую адукацыю ў больш кароткія тэрміны. Да таго ж пры паступленні на скарочаныя тэрміны навучання абітурыенты ўдзельнічаюць у конкурсе на падставе ўнутранага экзамену па дзвюх спецыяльных дысцыплінах, якія яны вывучалі ў каледжы, і не здаюць ЦТ. У пералік увайшлі больш як 150 спецыяльнасцяў.

Сярод іх, напрыклад, «дашкольная адукацыя» і «выхаваўчая работа ў групе падоўжанага дня». Выпускнікі каледжаў, якія навучаліся па гэтых спецыяльнасцях, могуць паступаць у ВНУ на спецыяльнасць «дашкольная адукацыя» на скарочаны тэрмін навучання.

Вучыцца ў ВНУ на псіхолага па скарочаных тэрмінах змогуць выпускнікі каледжаў, якія навучаліся на спецыяльнасцях «дашкольная адукацыя» і «пачатковая адукацыя». Навучанне ва ўстановах сярэдняй спецыяльнай адукацыі на спецыяльнасцях «тэхналогія перапрацоўкі расліннай і жывёльнай сыравіны» і «тэхналогія харчовай вытворчасці» дае магчымасць паступаць на скарочаны тэрмін навучання ў ВНУ на спецыяльнасць «біятэхналогія». Спецыяльнасць «ахова навакольнага асяроддзя і рацыянальнае выкарыстанне прыродных рэсурсаў» дае пропуск на «біяэкалогію». Спецыяльнасці «шматканальныя сістэмы тэлекамунікацый» і «сістэмы радыёсувязі, радыёвяшчання і тэлебачання» — на «ахову інфармацыі ў тэлекамунікацыях». «Медыка-дыягнастычная справа» і «сястрынская справа» — на «медыцынскую экалогію».

Абітурыенты могуць знайсці поўны пералік спецыяльнасцяў на партале Міністэрства адукацыі www.edu.gov.by у раздзелах Абітырыенту//Для тых, хто паступае ва ўстановы вышэйшай адукацыі//Прыём 2017.

Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@zviazda.by

■ Смачна есці!

УСІМ СЫРАМ СЫР

На гастранамічным фэсце ў Слаўгарадзе раскупілі паўтоны свойскіх сыроў

Не пралічыліся тыя, хто прыехаў у старадаўні Прапошаск на шосты фестываль «Гаспадарчы сыр». Калі ў Магілёве зранку ліў дождж, то ў сталіцы свята было хоць і крыху пахмурна, але суха.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Гэтым разам фестываль не стаў абмяжоўвацца канцэртнай пляцоўкай і павільёнам сыравараў. На прылеглай да мясцовага Цэнтра культуры тэрыторыі працавалі агратурыстычная вёска з рознымі падворкамі і жыўнасцю, вуліца рамеснікаў, дзіцячы гарадок з атракцыёнамі. На яшчэ адной пляцоўцы ў вёсцы Аляксандраўка аматары актыўнага адпачынку маглі пакатацца на веласіпедах, папарыцца ў лазні, паласавацца свойскімі прысмакамі. Але каралём свята, вядома, заставаўся сыр. У палатцы, дзе гандлявалі сыравары, было не праціснуцца. Галіна Таран, напрыклад, якая робіць 6 відаў казінага сыра, сваю навінку «Ля франсэ» прадала адразу ж, як толькі выклала на прылавак. Прыйшлося верыць на слова, што сыр быў найсмачнейшы. Гатавала яна яго 6 гадзін з 4 літраў малака. А сырніца Таццяны Гурынавай, або іншымі словамі — сыр у масле, наогул эксклюзіў, які гатавала яшчэ яе прабабуля. Усяго падчас фестывалю, па словах каардынатара праекта Алега Ерафеева, было распрададзена паўтоны мяккіх свойскіх сыроў і тварожных вырабаў — 50 гатункаў з каровінага і казінага малака.

— Фестываль дамашняга сыраварства рыхтаваўся сумесна з Фондам развіцця сельскіх тэрыторый у рамках праекта «Ад вытокаў да развіцця», — паведаміла **намеснік старшыні па сацыяльных пытаннях Слаўгарадскага райвыканкама Святлана ЯЗЕРСКАЯ.** — Сёлета яго асабліва актыўна падтрымалі рамеснікі, аграсядзібы, упершыню прыехала каля дзясятка турыстычных груп, каб зрабіць менавіта ў нашым раёне прыгожы старт у лета. Што датычыцца нашых сыравараў, дык яны ўжо добра вядомыя і ў вобласці, і ў рэспубліцы. Я жадаю толькі аднаго, каб пра іх шырэй пачулі і за межамі нашай краіны.

У фестывалі прынялі ўдзел прадстаўнікі з расійскіх Шумячаў, Польшчы.

— Фестываль нарадзіўся пры непасрэдным удзеле і падтрымцы праграмы малых грантаў пасольства ЗША, — расказвае гісторыю ўзнікнення свята **кіраўнік мясцовага фонду развіцця сельскіх тэрыторый «Адраджэнне Агра» Віталь ВАРАБЕЙ.** — Шэсць гадоў таму пачаўся рух сыравараў, сфарміравалася група, якая адрадзіла рэцэпты прыгатавання свойскіх сыроў. Вынікам стаў сырны фестываль, які вырас да такіх вось памераў.

Аматары сыра гатовы былі раскупіць і сыры слаўгарадскага філіяла «Бабулінай крынкі», які дэманстраваў дасягненні сваёй вытворчасці. На жаль, іх можна было толькі пакаштаваць. Амаль уся прадукцыя гэтага прадпрыемства ідзе на экспарт. Але была ўнікальная магчымасць асвоіць сакрэты дамашняга сыраварэння проста на месцы. Галіна Таран спецыяльна дала пачаткоўцам некалькі майстар-класаў. Тут жа на месцы можна было набыць сімпатычную казачку.

Дзеці не выпускалі з рук сімпатычную казачку.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
zigulya@zviazda.by

На сцэну... з касой

На «Еўрабачанне» ў Кіеве выканаўцы падрыхтавалі шмат сюрпрызаў

Ужо заўтра па самай доўгай у гісторыі шоу чырвонай дарожцы пройдуць артысты і музычныя калектывы з 42 краін-удзельніц, у тым ліку Румыніі і Партугаліі, якія з фінансавых прычын прапусцілі «Еўрабачанне» летась, і Аўстраліі, якая ў парадку выключэння і дзякуючы вялікай любові да конкурсу ўжо трэці раз штурмуе еўравізійныя вышыні.

Нагадаем, на гэтым свяце разнастайнасці сёлета не далічыліся толькі Расіі, прадстаўніцы якой украінскія ўлады забаранілі ўезд у краіну. У адказ расійскія тэлеканалы РТР і Першы канал адмовіліся трансляваць конкурс, таму зацікаўленым гледачам застаецца хіба сачыць за анлайн-трансляцыяй на афіцыйным сайце або глядзець наш міжнародны спадарожнікавы канал «Беларусь 24», які традыцыйна будзе весці трансляцыю абодвух паўфіналаў і фіналу «Еўрабачання». Да ўрачыстай цырымоніі адкрыцця конкурсу ў Кіеве, як запэўніваюць арганізатары, усё гатова, а агульны прыўзняты настрой не азмрочыў нават нядаўні інцыдэнт — з надпісу «Eurovision» каля галоўнай арэны невядомыя вандалы скралі апошнюю літару.

У аўторак, 9 мая, адбудзецца першы паўфінальны канцэрт. На сцэну Міжнароднага выставачнага цэнтра выйдуць (у парадку чарговасці) выканаўцы з 18 краін: Швецыі, Грузіі, Аўстраліі, Албаніі, Бельгіі, Чарнагорыі, Фінляндыі, Азербайджана, Партугаліі, Грэцыі, Польшчы, Малдовы, Ісландыі, Чэхіі, Кіпра, Арменіі, Славеніі і Латвіі. Адным з самых эксцэнтрычных абяцае стаць выступленне акцёра і выканаўцы з Чарнагорыі Слаўка Калезіча (між іншым, былога бойфрэнда сербскай пераможцы «Еўрабачання» Марыі Шэрыфавіч), які выкарыстоўвае як элемент шоу для песні «Зорка»... сваю даўжэзную касу. Не меншую ўвагу, пераважна з боку мужчын, мусіць выклікаць Кася Мось з Польшчы, якая, акрамя артыстычнага таленту, мае шыкоўную постаць і вопыт здымак для Playboy. Трыяна Парк з Латвіі, каб лепш запомніцца, зрабіла свой нумар флюарэсцэнтным...

Вікторыя ЦЕЛЯШУК. *tselyashuk@zviazda.by*

«Я СТАЯЎ ПАД РАССТРЭЛАМ»

ЯК ВЯСКОВЫ ВЕТЭРАН СУСТРАКАЕ ЧАРГОВУЮ ВЯСНУ ПЕРАМОГІ

Антон Кандратавіч Карпюк у свае 94 гады даглядае курачак, сёе-тое робіць па гаспадарцы, абавязкова ўдзельнічае ва ўсіх мерапрыемствах з нагоды Дня Перамогі, на якія яго запрашаюць. Цяпер ветэран жыве з сынам Пятром у доме, які ў свой час узвёў сваімі рукамі. І не толькі ўласны дом на яго рахунку. Амаль уся працоўная біяграфія шаноўнага вяскоўца звязаная з будаўнічай галіной.

Фота Сяргея ХМЕЛЯ.

А сваё першае баявое хрышчэнне Антон Карпюк атрымаў задоўга да фронту, у роднай вёсцы з пачаткам акупацыі. Калі немцы занялі Камароўку, у якой Антон нарадзіўся і жыў з бацькамі, хлопцу было 18 гадоў. Дасягнуў паўналецця, значыць, у ліку іншых дарослых мужчын атрымліваў нарады на работу ад новай улады. Непадалёку стаялі нямецкія часці, была камендатура. Антон разам са старэйшымі хлопцамі вазілі на ўласных падводах дровы. Вазілі туды, куды накіроўваў староста вёскі. Аднойчы такі нарад выпаў у населены пункт Кашары, прыкладна за 15 кіламетраў.

— Прывезлі, як заўсёды, сталі выгружаць, — расказвае ветэран, — а тут падышлі два ўласаўцы, былі і такія на службе ў немцаў, адзін стаў да мяне надта ўважліва прыглядацца, а потым адкрыта чапляцца: «Ты ўжо і дровы возіш, пад вяскоўца падстройваешся, а мы цябе кругом шукаем». Аказалася, у іх адзін ваеннапалонны ўцёк, і знешне той салдат быў на мяне падобны, ці, можа, ім так падалося. Я стаў пярэчыць, гаварыў, што мне толькі васямнаццаць няпоўнілася, я ў арміі не служыў, таму не магу быць ваеннапалонным. Але служака быў непахісным у сваіх падазрэннях. Сказаў, што пойдзе, прывядзе каго трэба і яны разбяруцца. Другі ж уласавец, здаецца, паверыў мне. Сказаў: «Выгружай, хлопец, свае дровы ды хутчэй з'язджай». Таварышы памаглі скінуць груз з воза, і я знік адтуль умомант. Думаў, што пранесла. Потым хлопцы расказвалі, што той, першы, вярнуўся і шукаў мяне паміж штабялямі дроў — Антон Кандратавіч робіць паўзу. Відаць, што ветэрану цяжка даюцца тыя ўспаміны. Тым больш што злыя прыгоды тым недарэчным падазрэннем не скончыліся.

Адбылася блытаніна з нарадамі на дастаўку дроў. І іх чацвёрка, адзін равеснік Антона, двое старэйшых ды ён, паехалі не туды, куды размеркаваў староста. А начальству нехта данёс, што хлопцы наогул не захацелі выйсці на работу.

— Нас павялі ў школу на разборы, — згадвае ветэран. — А высвятляць пытанне паставілі да сцяны. Там быў вельмі высокі фундамент. Чацвёра немцаў наставілі на нас вінтоўкі, я бачыў ствол амаль на ўзроўні сваіх вачэй... Мы думалі, што гэта ўсё... Як цяпер перад вачыма — немец у скураной куртцы, які размаўляў па-руску, яму варта было б махнуць рукой, падаць знак, і яны націснулі б на спускавыя кручкі. Мы сталі прасіць, тлумачыць, што паедзем сёння, куды скажуць, ніякага сабатажу, у якім нас абвінавачваюць, не было. І калі нас нарэшце адпусцілі, то я так ляцеў, што прамінуў сваю хату, і апамятаўся недзе праз дзве суседскія сядзібы.

«Яшчэ пашанцавала, — разважае ветэран, — магло б скончыцца нашмат горш». Як пашанцавала і з адпраўкай у Германію. Антон таксама атрымаў «павестку на будучае шчаслівае жыццё», як любілі гаварыць немцы. Разам з іншымі хлопцамі і дзяўчатамі яго завезлі ў Дамачава. Там Антон Карпюк сустрэў свайго былога школьнага настаўніка, які працаваў перакладчыкам у камендатуры. Да вайны наш герой скончыў чатыры класы польскай школы. Папрасіў настаўніка паспрыяць таму, каб іх адпусцілі дамоў. Бацькі наклалі ў дарогу сала, масла, яек. Трое таварышаў склалі ў торбу ўсе бацькоўскія харчы, і, на шчасце, знайшоўся ахвотнік да правіянту. Настаўнік прыйшоў, торбу забраў, а хлопцам сказаў вяртацца дадому. Выходзіць, адкупіліся.

На пачатку 1944-га згулялі вяселле з вясковай дзяўчынай Валянцінай. Дарэчы, аб сваім намеры ладзіць вяселле трэба было паведаміць прадстаўнікам улады, згадаў такую дэталь Антон Кандратавіч. Ён і схадзіў у камендатуру, паведаміў пра дату вяселля. У час гуляння прыйшлі два немцы, можа, каб упэўніцца, што тут сапраўды адбываецца вяселле, а не іншая сходка людзей.

Ну а летам прыйшло вызваленне. І ўжо 8 жніўня Антон Карпюк разам з 18-гадовым братам Пятром былі на зборным пункце, дзе фарміравалася папаўненне для фронту.

— За два дні да гэтага я яшчэ скасіў палоску жыта на нашым полі, — успамінае ветэран. — А 8-га мы прыехалі ў Дамачава, тады гэта быў райцэнтр. Адтуль нас павезлі на тэрыторыю Польшчы, памятаю, станцыя Сабалёва. Там мы праходзілі кароткае навучанне, можна сказаць, курс маладога байца. Пасля непрацяглых збораў — на фронт.

Ваяваць давялося ў пяхоце. Антон стаў кулямётчыкам.

Успаміны шаноўнага ветэрана пра тыя гады даволі эпізадычныя. Яно і не дзіўна, столькі часу прайшло. Памяць выдае асобныя карцінкі накшталт таго, што ў Вісле вада сіняя, а ў Одэры мела зеленаватае адценне. А яшчэ помніцца, з якімі цяжкасцямі даводзілася фарсіраваць рэкі. І наогул самая цяжкая работа на вайне — гэта работа пехацінца. Менавіта пра іх песню склалі: «Мы пол-Европы по-пластунски пропахали». Колькі іх палегла на франтах, асабліва вось такіх маладых, неабстраляных! Не вярнуўся і брат Пеця, які пайшоў на фронт 18-гадовым, застаўся ў чужой зямлі. Пазней Антон назаве ў яго гонар сына.

У адным з баёў Антон атрымаў цяжкае раненне, доўга лячыўся ў шпіталі. Потым вярнуўся ў часць. Памятае, як салютавалі з нагоды Перамогі. Стралялі з усіх ствалоў, якія толькі былі. Радаваліся, што вайна скончылася, што можна нарэшце вярнуцца дамоў.

Антон Карпюк вярнуўся ў родныя мясціны ў першай палове 1946 года. Спачатку купіў невялікую хату ў Тамашоўцы, потым на гэтым участку ўзвёў дом для сваёй сям'і. «Тут у мяне тры спальні», — не без гонару паказвае сваё жыллё ветэран. Яго ў акрузе ведаюць як майстра на ўсе рукі. Да пенсіі працаваў у будаўнічай брыгадзе. З жонкай Валянцінай Дзмітрыеўнай выгадавалі траіх дзяцей. Дачка жыве ў Тамашоўцы. Сын Пётр, былы мінчанін, спачатку быў тут наездамі, а калі не стала маці і ў самога паўстала пытанне аб рэабілітацыі пасля цяжкай хваробы, перабраўся да бацькі зусім. Тут свежае паветра, спакой, родныя сцены. Гаспадарчыя клопаты падзялілі па прыкмеце хобі, сын займаецца агародам, бацька даглядае свойскую птушку.

Дзень Перамогі ў доме па-ранейшаму самае вялікае свята. Абавязкова прыязджаюць унукі, праўнукі, накрываецца святочны стол.

«Сёлетняе свята ў Тамашоўскім сельсавеце сустракае ўжо адзіны ветэран вайны», — расказала **старшыня сельвыканкама Алена БУРАК**. Па традыцыі з віншаваннямі і падарункамі да Антона Кандратавіча прыходзяць прадстаўнікі мясцовай улады, акцыянернае таварыства «Камароўка», прадпрымальнік з вясковага прыватнага магазіна. Вучні Тамашоўскай школы запісалі ўспаміны ветэрана, выпусцілі адмысловы відэакліп. Дзядуля смяецца: «Дзеці прыйдуць, пытаюцца, што мне дапамагчы. А мы з сынам самі спраўляемся са сваёй няхітрай гаспадаркай. Але ж клопат прыемны».

Мерапрыемствы з нагоды Дня Перамогі, як заўсёды, пройдуць у Тамашоўскім доме культуры. І ветэрана па традыцыі запросяць на ўрачысты сход Брэсцкага раёна. Быць там ён лічыць сваім абавязкам. І сваім, і чужым дзецям, унукам, праўнукам ён заўсёды жадае, каб ніколі не пабачылі вайны.

Святлана ЯСКЕВІЧ. *yackevich@zviazda.by*
Брэсцкі раён.

ГАЛОЎНАЯ ЎЗНАГАРОДА

НЕ ЗАВАЁЎНІКІ, А ВЫЗВАЛІЦЕЛІ

— У апошні час даводзіцца чуць, што чаго толькі не рабілі савецкія вайскоўцы на подступах да Берліна, — працягвае аповед франтавік. — У складзе свайго батальёна я прайшоў амаль усю Германію, і ні разу не было выпадку, каб хтосьці з нашых афіцэраў, сяржантаў або салдатаў марадзёрствaваў або здзекаваўся з жанчын.

Немцы думалі інакш. Па словах ветэрана, многія населеныя пункты Германіі былі пустымі: людзі ўцякалі на захад. Барыс Мікалаевіч прыгадвае, як у горадзе Прэйсіш-Холанд спынілі цягнік, на якім хацелі з'ехаць мірныя жыхары. «Калі яны выйшлі з вагонаў, то, убачыўшы «варвараў» у форме савецкага салдата, былі моцна напалоханы, — расказвае ветэран. — Дзеці і жанчыны нават ішлі з паднятымі рукамі, дрыжэлі ад страху. Многія чамусьці здымалі свае наручныя гадзіннікі, спрабуючы аддаць іх нам. Ні адзін салдат не асмеліўся ўзяць сабе такі «падарунак». Убачыўшы гэта, немкі супакоіліся».

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

АРХІВЫ СВЕДЧАЦЬ

Свой першы медаль «За адвагу» Барыс Музалеўскі атрымаў ужо па заканчэнні вайны, амаль праз паўгода пасля яго прысвоення. Было гэта ў ваенным гарадку Цэль, што пад Асіповічамі, куды са сваёй брыгадай прыбыў у ліпені 1945 года. Тут і служылі па першым часе.

Пра тое, што ён узнагароджаны яшчэ адным медалём «За адвагу», ветэран Вялікай Айчыннай даведаўся днямі. І ўсё дзякуючы сучасным тэхналогіям: адпаведныя дакументы знайшлі ў электронным архіве Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі «Подзвіг народа ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.». Высокую ўзнагароду франтавіку ўручылі ў ваенным камісарыяце Бабруйска, Бабруйскага, Глускага і Кіраўскага раёнаў.

Барыс Музалеўскі расказвае пра свайго таварыша Аляксея Себяляева, які другі медаль «За адвагу» атрымаў адразу ж пасля вайны. «Я яшчэ падумаў, як гэта: ваявалі ж разам, да канца вайны адзін за адным ішлі, — кажа ветэран. — Падумаў і адразу ж забыўся пра тое. І каб не такая радасць, то і па сённяшні дзень не ўспомніў бы».

Акрамя таго, на парадным кіцелі франтавіка — ордэн Айчыннай вайны II ступені, медалі «За баявыя заслугі», «За ўзяцце Кёнігсберга», «За перамогу над Германіяй».

«ЧАЛАВЕК ПАВІНЕН РУХАЦЦА»

У Цэлі 47-ю асобную механізаваную брыгаду, у складзе якой ваяваў Барыс Музалеўскі, расфарміравалі.

— Злучэнне вялікае было: дзесьці 3,5 тысячы чалавек асабовага складу, — прыгадвае Барыс Мікалаевіч. — Перад боем на машыне мог змясціцца ўзвод: 28—30 чалавек. Калі вярталіся з Германіі, на машыне сядзела да пяці, не больш...

Узімку 1946 года яны ўпершыню за доўгія гады вайны адчулі шчасце і радасць. Учарашнія франтавікі спалі ў цёплых казармах, пабудаваных сваімі рукамі, дыхалі водарам смалы хваёвага лесу. Барыс Музалеўскі не планаваў заставацца ў арміі: дома чакала маці з сястрычкамі, трэба было аднаўляць разбураную немцамі хату. Але калі прыйшоў загад аб звальненні, папрасілі крыху паслужыць: вайсковыя шэрагі былі спустошаны вайной. Застаўся на цэлых 39 гадоў, у адстаўку пайшоў палкоўнікам.

Дзе Барыс Музалеўскі толькі не служыў: Пскоўская і Кіраўская вобласці, Байканур, Арэнбург, Краснадарскі край, Варкута... І заўсёды з ім была любячая жонка, Соф'я Васілеўна. Неўзабаве споўніцца 65 гадоў, як яны разам.

...Мы размаўляем з Барысам Мікалаевічам, і нікольк не адчуваецца, што яму ідзе ўжо 91-ы год. Прыгожы, інтэлігентны, ён не выглядае на свой узрост. Не падводзіць і памяць. «Проста не трэба сядзець на канапе і глядзець тэлевізар, — дзеліцца сакрэтам свайго даўгалецця ветэран. — Чалавек павінен рухацца. Заклікаю суседзяў на суботнік, а не кожны з іх ахвотны папрацаваць».

Вясной і летам да Барыса Мікалаевіча не дазваніцца. На ім — усе клумбы аднаго з бабруйскіх дворыкаў. Ён іх садзіць, поле, прывозіць у парадак да зімы. Дзякуючы 90-гадоваму ветэрану, расцвітуць тут кветкі і на гэтае лета. Жадаем, каб прыгожа і духмяна тут было як мага даўжэй.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Вераніка КАНЮТА.
kanyuta@zviazda.by
г. Бабруйск.

Больш фота на сайце zviazda.by.

■ Прававая гасцёўня

ШЛЮБНЫ ДАГАВОР

Калі, дзе і як можна яго заключыць

На пытанні адказвае **Алена МІРОШНІКАВА, галоўны спецыяліст упраўлення натарыята і загсаў Міністэрства юстыцыі Беларусі.**

У хуткім часе плануем зарэгістраваць шлюб. Будучы муж настойвае на заключэнні шлюбнага дагавора. Калі, дзе і як гэта можна зрабіць?

Марына П., *г. Бабруйск.*

— Шлюбны дагавор — гэта па сутнасці пісьмовае пагадненне паміж асобамі, якія ўступаюць у шлюб ці ўжо жанатыя, у якім вызначаюцца правы і абавязкі мужа і жонкі ў шлюбе, а таксама ў выпадку яго скасавання. Так што скласці гэты дакумент можна да шлюбу, пасля яго рэгістрацыі, а таксама на працягу ўсяго знаходжання ў шлюбе.

Згодна з часткай першай артыкула 13-1 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і (далей — Кодэкс), шлюбны дагавор заключаецца пісьмова і павінен быць засведчаны натарыяльна.

Дзеянне шлюбнага дагавора пачынаецца з дня рэгістрацыі заключэння шлюбу для асоб, якія ўступаюць у шлюб, або з дня яго натарыяльнага засведчання для тых, хто ўжо жанаты.

Умовы шлюбнага дагавора, якія з'яўляюцца ці могуць стаць падставай узнікнення, пераходу, спынення правоў, абмежаванняў (абцяжарванняў) правоў на нерухомую маёмасць, уступаюць у сілу з дня дзяржаўнай рэгістрацыі шлюбнага дагавора ў арганізацыі па дзяржрэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй.

Асаблівасць названага дакумента ў тым, што яго нельга заключыць праз прадстаўніка, паколькі ён мае выключна асабісты характар.

Чытала, што пры складанні шлюбнага дагавора ў яго змест можна дадаць свае пункты. Што дакладна можна ўключыць у гэты дакумент?

Вераніка Т., *г. Слонім*

Заканадаўства не абмяжоўвае пералік умоў, якія можна ўключыць у шлюбны дагавор. Разам з тым яны павінны быць выканальнымі, не супярэчыць заканадаўству і не парушаць правы і законныя інтарэсы іншых асоб. Нельга, каб абмяжоўвалася праваздольнасць і дзеяздольнасць мужа ці жонкі, іх правы на зварот у суд па абарону сваіх правоў і законных інтарэсаў або каб адзін з іх трапляў у надта неспрыяльнае становішча.

У шлюбным дагаворы можна вызначыць наступнае:

— парадак раздзелу маёмасці, якая з'яўляецца агульнай сумеснай уласнасцю мужа і жонкі;

— што з сумесна нажытай маёмасці будзе перададзена кожнаму з бакоў пасля скасавання шлюбу;

— умовы адносна змянення ўстаноўленага заканадаўчымі актамі Беларусі рэжыму агульнай сумеснай уласнасці мужа і жонкі шляхам устанаўлення долевай уласнасці або ўласнасці кожнага з бакоў на ўсю маёмасць, якая падлягае аднясенню, згодна з заканадаўчымі актамі краіны, да агульнай сумеснай уласнасці, ці на асобныя віды такой маёмасці;

— умовы адносна немагчымасці прызнання маёмасці кожнага з бакоў іх агульнай сумеснай уласнасцю, калі падчас шлюбу за кошт агульнай маёмасці мужа і жонкі або асабістай маёмасці другой паловы будуць зроблены ўкладанні, якія значна павялічаць кошт гэтай маёмасці (капітальны рамонт, рэканструкцыя і г. д.);

— іншыя пытанні ўзаемаадносін паміж мужам і жонкай (парадак нясення кожным з іх сямейных выдаткаў і іншае), бацькамі і дзецьмі, калі гэта не парушае правы і законныя інтарэсы іншых асоб і не супярэчыць заканадаўству Беларусі.

У шлюбным дагаворы можна таксама вызначыць правы і абавязкі мужа і жонкі па ўзаемным утрыманні, у тым ліку пасля скасавання шлюбу, і іншыя пытанні іх узаемаадносін.

Пытанні ўдзелу ў выхаванні сваіх непаўналетніх дзяцей, устанаўлення іх месца пражывання з адным з бацькоў і парадак стасункаў з другім у выпадку асобнага пражывання маці і бацькі, а таксама пасля скасавання шлюбу, выезда дзяцей за мяжу, памер аліментаў і іншыя пытанні ўтрымання і выхавання дзяцей таксама можна прапісаць у шлюбным дагаворы.

Наш шлюбны дагавор прадугледжвае, што ў выпадку скасавання шлюбу я абавязаны матэрыяльна ўтрымліваць былую жонку і штомесяц выплачваць ёй па 20 базавых велічынь на працягу пяці гадоў пачынаючы з наступнага пасля разводу месяца. Я трапіў у складанае жыццёвае становішча і выкананне гэтай умовы для мяне цяпер стала вельмі складаным. Ці можна змяніць дагавор, калі былая жонка згодна на гэта?

Вячаслаў Раманенка, *Скідзельскі раён.*

Так, калі былая жонка згодна, вы можаце змяніць умовы свайго шлюбнага дагавора.

Згодна з артыкулам 13 Кодэкса дзеянне шлюбнага дагавора спыняецца з моманту скасавання шлюбу, калі іншае не прадугледжана гэтым дакументам, Кодэксам ці іншымі актамі заканадаўства Беларусі. Калі ж у шлюбным дагаворы прапісаны правы і абавязкі былых мужа і жонкі пасля скасавання шлюбу, то гэты дакумент дзейнічае да іх выканання.

Шлюбны дагавор па ўзаемнай згодзе могуць змяніць або скасаваць асобы, якія толькі ўступаюць у шлюб, муж і жонка да скасавання шлюбу, а таксама былыя муж і жонка — падчас дзеяння гэтага дакумента ў форме і парадку, якія прадугледжаны для яго заключэння. Аднабакова адмовіцца ад выканання шлюбнага дагавора нельга.

Шаноўныя чытачы, калі ў вас узніклі пытанні юрыдычнага характару, дасылайце іх на наш паштовы або электронны адрас sidarok@zviazda.by. У «Прававой гасцёўні» разам са спецыялістамі Мінюста мы будзем шукаць на іх адказы

СУПРАЦЬ ЦЯЧЭННЯ ДА МАРЫ

З Дзімам Марозавым, хворым на ДЦП, мы сустракаліся паўтара года таму. Тады і быў напісаны матэрыял, прысвечаны блуканням маладога чалавека па інстанцыях у пошуках адказу на пытанне: кім жа ён можа працаваць. Часу прайшло быццам і не шмат, але ж сам юнак кажа, што тыя нашы з ім сустрэчы і матэрыял, напісаны па іх выніках, сапраўды значна паўплывалі на яго жыццё. І не толькі фактам знойдзенай работы ў гомельскай гарадской бібліятэцы №3.

— Я стаў весялейшым, — прызнаецца Дзіма. — Навучыўся адціскацца яшчэ і на адной руцэ — па 20 разоў на кожнай. Цяпер веру ў сябе. Я ўжо не плыву супраць цячэння, але актыўна працую над уласнымі мінусамі. Спадзяюся, для кагосьці гэта стане прыкладам.

Самае цікавае, шчыра здзіўляецца Дзіма, што яму нарэшце выдалі пажыццёвую даведку з МРЭКа — пра інваліднасць. А яшчэ ў ёй самае важнае: дазвол працаваць не толькі бібліятэкарам, але і праграмістам.

Вось да апошняй мэты малады чалавек, які ўжо мае вышэйшую філалагічную адукацыю, цяпер і робіць упэўненыя крокі. Ён паступіў і паспяхова вучыцца дыстанцыйна ў Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі:

— Я хачу мець актыўную жыццёвую пазіцыю. Ад чалавека павінна сыходзіць больш дзеянняў, чым слоў. У мяне цяпер сапраўды новыя думкі, новая самаацэнка, новыя мэты. Я нарэшце прыйшоў да таго, што сярэднім хлопцам я ніколі не буду. Як ні круці, але мае асаблівасці мне не дазваляюць быць сярэднім. Таму буду імкнуцца быць лепшым за ўсіх. Ведаеце, больш у нашым жыцці залежыць ад нас саміх, чым ад лёсу.

Малады чалавек захоплены вучобай у сталічнай ВНУ: заканчвае цяпер другі курс. Кажа, што піша пры гэтым курсавую работу, якая адпавядае ўзроўню чацвёртага. Да гэтага на спасціжэнне матэматыкі патраціў паўгода. Вучыў яе па кнігах самастойна і такім чынам дакапаўся да таго, што яму сёння патрэбна.

— Пакуль у мяне ёсць магчымасці навучацца ў тым ліку па-за праграмай універсітэта, я гэтым карыстаюся. Мая мэта — атрымаць міжнародны сертыфікат і сапраўднае веданне англійскай мовы. Я разумею, што гэта адкрые для мяне дарогу ў будучыні. Я аплаціў інтэрнэт-курсы і займаюся мовай самастойна. Да таго ж слухаю аўдыязапісы, гляджу тэматычнае відэа з субцітрамі і ў месяц вучу 2-3 песні на англійскай мове. На мой погляд, сёння рэпетытарства патрэбна толькі лянівым. Для тых, у каго няма асабістай матывацыі, хто хоча, каб яго нехта звонку матываваў для заняткаў. Вось напісаў артыкул, прысвечаны тэме матрыц. Да таго ж пераклаў яго на англійскую мову і адкарэкціраваў. Таксама магу пераказаць яго па-англійску.

Між тым бацькоў, якія па-ранейшаму жывуць у Красным Беразе на Жлобіншчыне, Дзіма таксама зацікавіў вывучаць англійскую. І нават аплаціў ім аналагічны курс інтэрнэт-навучання. Кажа: а раптам я буду стажыравацца недзе за мяжой і бацькі да мяне захочуць прыехаць?

— Я настойлівы чалавек. Бацькам будзе лягчэй англійскую мову вывучыць, чым мяне пераканаць яе не вучыць. Такім чынам я сёння дапамагаю ім вырашыць іх заўтрашнія праблемы.

Дзіма дзеліцца марамі: ён ужо ведае, дзе б хацеў працаваць у найбліжэйшай будучыні — згодна з новай адукацыяй. Аднак гаворыць, што пакуль не дацягвае па ўзроўні да сваіх мэт.

— Вось напісаў праграму па аўтаматычнай зборцы кубіка Рубіка. Што датычыцца алгарытмаў — яны дастаткова складаныя, і літаратуры на гэтую тэму няма ўвогуле. На будучыню мяне цікавіць камп'ютарная графіка. Урэшце мне хацелася б працаваць на сябе, стварыць сваю фірму. У мяне ёсць мазгі, каб ствараць нешта карыснае. І менавіта тут, у Беларусі, я бачу перспектывы. За мяжой мне куды больш цяжка будзе ўладкавацца.

Мы гаворым не толькі пра працу, але і пра стасункі. Мінулым разам больш за ўсё менавіта яны перашкаджалі хлопцу даказваць сабе і свету, што ён не варты жалю.

— Я павінен быць лепшым. І таму людзі павінны адчуваць не жаль, а павагу. Інакш перспектыў на асабістае жыццё не будзе. Мне хочацца мець стасункі з аднадумцамі. Я хачу, каб побач са мной знаходзіліся людзі, якія да нечага імкнуцца. На будучыню мне патрэбны чалавек майго плана, які будзе развівацца разам са мной. Гэта ж вельмі сумна: ляжаць перад тэлевізарам. Не хачу жыць так, як многія мае знаёмыя. Я навучыўся пазбягаць тых сітуацый, у якіх некаму нешта трэба даказваць. Мая задача — зрабіць так, каб мая будучая жонка была самай шчаслівай. Я не разлічваю на падачкі. Мне самому трэба будзе забяспечыць сям'ю, у тым ліку жыллём. Таму я павінен прафесійна рэалізавацца. Проста пакуль я не знайшоў той, каму прысвячу сваё жыццё. Але гэта будзе: ці сёлета, ці налета. Гэта я адчуваю інтуітыўна. За гэтыя два гады я адбыўся як мужык, які ведае, чаго ён хоча, і сваё не ўпусціць.

Вельмі важна, каб у чалавека верылі яго сваякі. Тэма вельмі далікатная, бо не так часта сустракаюцца станоўчыя прыклады. Вось і Дзіма над гэтай тэмай разважае сур'ёзна.

— Калі я паступіў на філфак у Гомель, доўга не мог зразумець, чаму гэтым фактам усе так захапляюцца. Толькі цяпер зразумеў. У іх вачах я скокнуў вышэй за сваю галаву, быццам дасягнуў нейкай максімальнай мэты. Магчыма, многія сумняваліся ўва мне. Між тым ёсць больш жорсткія рэчы, з якімі я сутыкнуўся. Я ехаў вучыцца і жыць у Гомель і пры гэтым не ўмеў прыгатаваць ежу. Такога, як я, трэба з маленства вучыць лепш сябе абслугоўваць. Гэта не толькі мая праблема. Па сутнасці, я з гэтага становішча самастойна выбіраўся. Можа, таму да нядаўняга часу мая самаацэнка была ніжэйшая за плінтус. Ведаеце, маю псіхіку карабаціла: з аднаго боку — захапленне, з іншага — цынічнае «супакойся, ты ўсяго магчымага дасягнуў». Такая супярэчнасць. Калі б не меў характару, які прымушае мяне плыць супраць цячэння, нічога ў мяне не атрымалася б. Бацькам прыйшлося б мяне ўтрымліваць усё жыццё.

Ёсць яшчэ адна тэма, якую я нават баюся кранаць. Два гады таму Дзмітрый Марозаў перажыў сітуацыю, калі калегі проста «выціснулі» яго з працоўнага месца, якое ён атрымаў па размеркаванні. І ўсё ж гутарка пра гэта заходзіць.

— Наконт школы, дзе мне не дазволілі працаваць. Сёння я ўдзячны лёсу, што адтуль сышоў. Але ж гэта зусім не апраўдвае тых людзей, якія гэтаму пасадзейнічалі. Ведаеце, я сёння хачу падзякаваць усім, хто мне дапамагаў, асабліва ў крытычныя моманты майго жыцця. І тым, хто ў мяне верыў і чыя вера ў мяне часам была мацнейшая, чым мая.

Пасля гутаркі з Дзімам Марозавым чарговы раз думаю, што чалавек сапраўды мае неабмежаваныя магчымасці. Калі ён сам нешта хоча змяніць у сваім жыцці.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
iost@zviazda.by

■ Філатэліст

СПАЧАТКУ БЫЛА КОНКА

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь 10 мая выпускае ў абарачэнне чатыры паштовыя маркі з серыі «125 гадоў з часу ўводу ў эксплуатацыю Мінскай конкі».

Гэты від транспарту праслужыў жыхарам і гасцям сталіцы амаль 40 гадоў, ён жа стаў асновай для больш сучаснага — электрычнага трамвая. Праект падрыхтаваны па матэрыялах з Музея гісторыі горада, дзе, дарэчы, адкрыта пастаянная экспазіцыя, прысвечаная Мінскай концы. У дзень выпуску марак у аддзяленні паштовай сувязі №1 Мінска (крама «Філатэлія», вул. Маскоўская, 16) будзе праводзіцца спецыяльнае гашэнне на канверце «Першы дзень»

■ Зварот у карпункт

ЖЫЛЬЦЫ СУПРАЦЬ «100 ГРАМАЎ»

У Віцебску жыхары шматпавярховага дома супраць таго, каб на першым паверсе працавала чарачная

Называюць гэту ўстанову грамадскага харчавання, дарэчы, вельмі сімвалічна — чарачная «100 грамаў». Шыльда з такой назвай вісіць і пры яе ўваходзе, хоць у Гандлёвым рэестры назва аб'екта — «Чарачная». Журналіста запрасілі на дваровы сход.

«Думалі, што будзе піцэрыя»

А дзявятай гадзіне вечара ў двары жылога дома №18 на вуліцы Чапаева было шумна. Жыльцы на чале з кіраўніком таварыства ўласнікаў жылля сабраліся, каб абмеркаваць праблемы. І ў першую чаргу «топавую» тэму: пра «100 грамаў».

Жарсці кіпелі. Перыядычна здавалася, што без, як кажуць у народзе, 100 грамаў не абысціся. У прыватнасці, шмат нараканняў пачуў кіраўнік таварыства ўласнікаў жылля. Маўляў, чаму дапусцілі?..

Вулічныя «спікеры» і «маўчуны» пакідалі подпісы ў звароце да ўлады. Павышаючы тон, гаварылі, што збіраюцца пісаць скаргу і ў рэспубліканскія органы ўлады. Некалькі чалавек былі вельмі рады візіту карэспандэнта з рэдакцыі дзяржаўнай газеты...

Суразмоўцы расказалі, што чарачная пачала працаваць восенню мінулага года. Вялікае памяшканне было здадзена ў арэнду ўласнікам вядомай у абласным цэнтры кампаніі, якая спецыялізуецца на грамадскім харчаванні. Яе фірмавыя піцэрыі вельмі папулярныя ў гараджан і гасцей горада.

— Мы і думалі, што чарговая піцэрыя запрацуе ў нашым доме. Але, на жаль, адкрылася чарачная, — расказвае вельмі эмацыянальная жанчына.

Пакуль у натоўпе абмяркоўвалі тэму, побач гулялі і забаўляліся юныя жыльцы. Вядома, можна зразумець дарослых. Іх дзеці штодня бачаць нецвярозых, якія выходзяць са «100 грамаў». Ды і чарку-другую апошнія выпіваюць у месцы побач з дзіцячым садком і сярэдняй школай.

Крэатыўная рэклама, але...

Шчыра кажучы, «пунктаў» для таго, каб пасядзець за кубачкам кавы або чаркай больш моцнага напою ў абласным цэнтры параўнальна мала. А дом, пра які ідзе гаворка, знаходзіцца ў даволі элітным месцы. Побач — Цэнтральны спартыўны комплекс. Праз пару-тройку прыпынкаў грамадскага транспарту — галоўная сцэна фестывалю «Славянскі базар у Віцебску». А недалёка ад амфітэатра знаходзяцца органы ўлады, сімвал горада — ратуша. Пры ўсім гэтым, вуліца Чапаева ў параўнальна ціхім раёне. Недалёка — рэчка, у гонар якой атрымаў назву Віцебск, на берагах — парк адпачынку...

Жыць і радавацца толькі. Яшчэ тры гады не прайшло, як дом, у якім больш за 200 кватэр, здалі ў эксплуатацыю. Шматпавярховік, дарэчы, адзін з самых высокіх — 18-19 паверхаў. І тут, як той казаў, на табе — праблемы...

— Бяда яшчэ і ў тым, што ўваход у «100 грамаў» паміж двума пад'ездамі. Нецвярозыя з установы выходзяць у тым ліку і каб пакурыць. А колькі разоў біліся! Міліцыю выклікалі, каб парадак навялі, — расказвае пенсіянерка.

Наліваюць у «100 грамах» да 23.00. І без выхадных. Непрыемнасць суседства ўзмацняе «крэтыўная» рэклама піцейнай.

— Над дзвярыма, уявіце, лозунг: «Заходзь — ужо наліваюць». На караценькіх шторках былі надпісы: «Сто грам — не стоп-кран», «Адвёў жонку ў фітнес, заходзь да нас, накачаем», «Купіў машыну — абмыем!». Праз месяц над дзвярыма вывесілі плакат: «З 8 раніцы пахмяляем, да 23 наліваем!», — расказваюць жыльцы. Пра гэта яны напісалі на інтэрнэт-форуме бацькоў Віцебска. Народ, каментуючы, не хаваў эмоцый... Асартымент закускі, як адзначаюць пастаянныя наведвальнікі, чыста «стаграмовы». Напрыклад, бутэрброды, хлеб, селядзец, агурок... Плюс чабурэкі і некалькі відаў супоў.

— А вось прыстойнай кавы ў іх няма. Хацела латэ або капучына, а мне прапанавалі бурды, прабачце, размяшаць: тры ў адным! — канстатавала жыхарка дома.

Звярталіся, будуць

Пасля звароту ў адміністрацыю Кастрычніцкага раёна «вясёлыя» плакаты, якія заклікаюць ужываць алкаголь, перавесілі «тварам» унутр. Плакат-шторка аблямоўвае знутры вокны ўстановы. І наведвальнікі чытаюць надпісы, а не людзі на вуліцы, як раней.

Чарачная ўзятая на кантроль аддзелам унутраных спраў. Прынятае рашэнне, як адзначана ў афіцыйным адказе, «арыентаваць нарады ППС да месца знаходжання названай піцейнай установы». З яе кіраўніком правялі тлумачальную размову.

А ці насамрэч законна было адкрываць чарачную ў жылым доме? Як адзначаюць ва ўпраўленні гандлю і паслуг Віцебскага гарвыканкама, гэта не супярэчыць адпаведным санітарным нормам і гігіенічным нарматывам.

Жыльцы таксама незадаволеныя тым, што без згоды таварыства ўласнікаў замацавалі на фасадзе выцяжную сістэму. На погляд незадаволеных, выканана яна няправільна. Шум падчас функцыянавання чуюць жыхары ў кватэрах нават на вялікай вышыні. Ды і пах ежы з чарачнай можна адчуць за дзясяткі метраў ад яе. У тэхнічных нюансах, безумоўна, павінны разабрацца спецыялісты.

Жыльцы, пазіцыю якіх не разумеюць, прапаноўваюць уявіць сабе: хацелі б вы жыць у такім доме? Я асабіста, як жыхар хрушчоўкі, так. Але суседства з установай, дзе да ночы можна выпіць, не парадуе нікога.

Звароты ў розныя інстанцыі па дапамогу ад жыльцоў яшчэ будуць. Карэспандэнт таксама ўжо праінфармаваў гарвыканкам пра пачутыя праблемы. «Звязда» сочыць за працягам гэтай нестандартнай гісторыі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ. *pukshanski@zviazda.by*

ПАБАЧЫЦЬ ЗАМОР'Е І З ГРАШЫМА ЗАСТАЦЦА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Перад водпускам нялішнім будзе прагледзець водгукі аб гатэлях, вывучыць інфармацыю аб мясцовых славутасцях, планаваць, якая сума вам спатрэбіцца для камфортнага адпачынку. Таксама пачытайце там, ці карыстаюцца турысты плацежнымі карткамі менавіта ў гэтай краіне, наколькі гэта зручна, бяспечна і выгадна. Адпаведная інфармацыя абавязкова знойдзецца на любым турыстычным форуме. Пагадзіцеся, вялікую каштоўнасць маюць меркаванні тых, хто ўжо мае практычны вопыт выкарыстання «пластыку» ў тым ці іншым месцы, чым сухая тэорыя, прачытаная ў стандартным даведніку.

Пры ажыццяўленні наяўных валютаабменных аперацый у некаторых краінах часта бярэцца вялікая камісія — да 10% ад сумы і нават больш.

Неабходна ўлічваць і свае асабістыя інтарэсы. Камусьці падабаецца прыйсці на мясцовы рынак, адчуць каларыт, дух краіны, патаргавацца, перакусіць у мясцовым кафэ. Аднак рэдкі рынак можа пахваліцца наяўнасцю тэрміналаў для прыёму аплаты па картках. Хтосьці аддасць перавагу набыццю сувеніраў у буйным гандлёвым цэнтры і там жа захоча паабедаць — у гэтым выпадку, верагодна, праблем з такой аплатай не ўзнікне. Падумайце, як вы будзеце бавіць час у замежнай паездцы, і, выходзячы з гэтага, прымайце рашэнне, колькі наяўных вам спатрэбіцца.

На ўсялякі выпадак

Нават калі наведваеце развітую еўрапейскую краіну, дзе разлічыцца карткай можна без праблем практычна ўсюды, усё роўна неабходна ўзяць з сабой нейкую суму гатоўкай. Фінансісты называюць гэта дыверсіфікацыяй рызык, бо нельга трымаць усе яйкі ў адным кошыку. Нават там могуць узнікнуць праблемы тэхнічнага характару, як з боку плацежнай сістэмы, так і з боку банка, могуць не працаваць канкрэтныя банкаматы і гэтак далей. Таму наяўныя таксама павінны быць.

За мяжой звычайна карыстаюцца наяўнымі грашыма там, дзе нельга расплаціцца карткай. Пры паездцы ў Еўропу пажадана браць гатоўкай каля траціны ад той сумы, якую плануецца выдаткаваць. Каля 30% ад агульнай сумы — гэта тая доля грошай, якая дазваляе набываць нейкія пакупкі ў сферы дробнага гандлю або «пракантавацца» ў выпадку праблем з картачнай інфраструктурай.

Браць лепей з чыпам

Зразумела, што картка для паездкі за мяжу павінна валодаць міжнароднай функцыяй. Тут аднолькава добра падыдуць карткі плацежных сістэм Visa і MasterCard і кабейджынгавы прадукт БЕЛКАРТ-Maestro. Пры гэтым было б нядрэнна мець з сабой карткі і Visa, і MasterCard, або Visa і БЕЛКАРТ-Maestro. Часам можна сутыкнуцца з сітуацыяй, калі карткі адной з міжнародных плацежных сістэм не прымаюць.

Фінансавыя аналітыкі ў першую чаргу рэкамендуюць для замежных паездак чыпаваныя карткі выходзячы з пытанняў бяспекі. Больш за тое, здараецца, што па картцы без чыпа адмаўляюць у абслугоўванні. Па правілах плацежных сістэм павінны прымацца і з магнітнай паласой, але тым не менш з падобнай сітуацыяй у Еўропе можна сутыкнуцца.

Канверсія валюты

Пытанне выбару валюты рахунку з'яўляецца самым складаным. Калі вы едзеце ў зону еўра з карткай, намінаванай у еўра (ці, скажам, у Амерыку з «пластыкам», намінаваным у доларах) — верагодна, атрымаецца зусім пазбегнуць якіх-небудзь канверсійных страт. Аднак і тут магчымыя варыянты, таму лепш загадзя ўдакладніць у банку, ці будзе праводзіцца нейкая канверсія ў выпадку, калі валюта вашага рахунку і валюта аперацыі супадаюць. Калі ў ходзе замежнай паездкі вам трэба будзе разлічвацца ў тугрыках, рупіях або тэнге — канверсійных страт, хутчэй за ўсё, не пазбегнуць.

Заўсёды трэба шукаць лепшы варыянт менавіта для вашага маршруту, бо канверсійную палітыку кожнага канкрэтнага банка дасканала ведае толькі сам банк. Таму звярніцеся да яго спецыялістаў і раскажыце, куды збіраецеся ехаць. Лепш прыводзіць канкрэтную сітуацыю — еду туды, планую патраціць такія грошы, скажыце, колькі я страчу на канверсіі? Калі канверсійная палітыка вас не задавальняе, то лепш «прамацаць глебу» ў іншых банках і падабраць аптымальны менавіта для вас варыянт.

І яшчэ. Трэба ўлічваць, што курсы плацежных сістэм, як і курсы банкаў, вызначаюцца штодня, таму ў банку вам змогуць агучыць толькі прыблізную суму, якая на практыцы можа мяняцца. Трэба разумець, што калі вы едзеце на два дні ў Маскву і плануеце выдаткаваць там 100 долараў, то ў любым выпадку страты будуць невялікімі і наўрад ці гэта падстава мяняць звыклы банк і выпускаць новую картку. А вось калі вы едзеце за мяжу з буйной сумай, пытанне канверсійных страт неабходна разглядаць больш уважліва. У кожнага чалавека сваё стаўленне да канверсійных выдаткаў. Хтосьці ўспрымае негатыўна нават самыя нязначныя страты, кагосьці гэтае пытанне наогул не турбуе. Падумайце, колькі грошай асабіста вы гатовыя страціць на канверсіі.

Акрамя таго, трэба ведаць, што пры ажыццяўленні наяўных валютаабменных аперацый у некаторых краінах часта бярэцца вялікая камісія — да 10% ад сумы і нават больш. І гэтае пытанне перад паездкай таксама неабходна ўдакладніць.

А яшчэ ёсць краіны, напрыклад, Польшча, дзе вам могуць прапанаваць разлічыцца на выбар у некалькіх валютах — у злотых, доларах, еўра ці нават беларускіх рублях, каб вам было «больш зразумела і зручней». Калі ў вас картка ў доларах, аперацыі з гэтай валютай праводзяцца без канверсіі, і вам прапануюць разлічыцца ў «зялёных» — гэта выдатна. А вось разлік у беларускіх рублях, якія «зручнейшы» для нас, у гэтым выпадку можа прывесці да значных канверсійных выдаткаў.

Пытанні ўласнай бяспекі

Незалежна ад таго, едзеце вы за мяжу з наяўнымі або з карткай, вы будзеце несці пэўныя рызыкі. Страціць можна і гатоўку, і картку. Украсці могуць як наяўныя, так і сродкі з «пластыку».

Ёсць краіны з каласальным узроўнем злачыннасці. Для некаторых дзяржаў, напрыклад краін Лацінскай Амерыкі, прыдумалі нават цэлую картачную тэхналогію па мінімізацыі крымінальных рызык. Гэта так званы другі пін-код. Калі рабаўнік чакае вас каля банкамата, вы ўводзіце спецыяльны, сакрэтны пін. Сістэма «разумее», што побач стаіць бандыт, і паказвае чыста сімвалічную рэшту — напрыклад, некалькі долараў. Для такіх краін не існуе вялікай розніцы — ехаць з карткай або з «кэшам». Верагоднасць патрапіць пад прэс крымінальных структур вельмі высокая, і валоданне нейкай сумай грошай незалежна ад таго, на карце яны ці ў кашальку, ужо ставіць вас у спіс патэнцыйных ахвяр для злачынцаў.

А вось для трымальнікаў плацежных картак ёсць універсальныя правілы — напрыклад, карыстацца банкаматамі ў аддзяленнях банкаў або ў гатэлі. Лепш разлічвацца карткай менавіта ў буйных гандлёвых цэнтрах. Аднак, далёка не ў кожным горадзе ёсць буйны гандлёвы цэнтр, асабліва на ўзбярэжжах. А калі, вобразна кажучы, вы здымаеце з карткі некалькі тысяч долараў, пры гэтым сярэдняя зарплата работніка гатэля складае каля 10 долараў, цалкам верагодна, што ён не будзе моцна даражыць сваёй рэпутацыяй і можа патэлефанаваць адпаведным таварышам, якія за вуглом вас з гэтай сумай будуць з нецярпеннем чакаць. Таму трэба быць вельмі ўважлівымі і ставіцца да карткі гэтак жа асцярожна, як і да наяўных грошай. Можна спадзявацца на банк, на плацежную сістэму, але кожны чалавек павінен у першую чаргу сам вырашаць пытанні сваёй бяспекі.

Спецыялісты рэкамендуюць з аглядкай карыстацца карткай у краінах, якія ў плане махлярства зарэкамендавалі сябе не вельмі добра. Гэта датычыцца краін Лацінскай Амерыкі, Тайланда, Індыі, Інданезіі, Кітая і іншых дзяржаў азіяцкага рэгіёна. Карткамі трэба карыстацца асцярожна ў Расіі і ва Украіне.

Сяргей КУРКАЧ.
kurkach@zviazda.by

Некалькі простых парад тым, хто плануе ехаць за мяжу з карткай



Пры зняцці гатоўкі ў банкаматах за мяжой камісію з вас можа зняць і ваш беларускі банк (банк-эмітэнт), і банк-экваер, якому належыць банкамат.

Калі ў краіне, якую вы збіраецеся наведаць, няма праблем з інтэрнэтам, грошы на картку можна пераводзіць з іншага рахунку часткамі, па меры расходавання, з дапамогай інтэрнэт-банкінгу ці іншых каналаў дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання.

Падключыце sms-апавяшчэнне, яно аператыўна паведаміць вам пра спробы доступу да вашага рахунку і дазволіць своечасова зрэагаваць і заблакаваць картку. Звярніце ўвагу, што для гэтага тэлефон павінен працаваць у роўмінгу.

■ Роднае — моднае

Алімпійскія гульні ў... «Пальчатку» і «Лапту»

Ці зможа медзведзяня Тосік заваяваць сэрцы ўсіх беларусаў?

Унікальнае культурна-спартыўнае свята адбудзецца 13 мая ў сталіцы на стадыёне БДПУ — 9 камандаў, якія прадстаўляюць усе раёны Мінска, збяруцца, каб вызначыць самага хуткага, самага дужага, самага спрытнага і самага кемлівага ў... народных гульнях. Спартыўна-адукацыйны праект «Беларусіяда» выходзіць на гарадскі ўзровень. Пра тое, як нарадзілася ідэя аб'яднаць людзей вакол беларускіх народных гульняў, нам расказаў яе аўтар, старшы выкладчык кафедры тэорыі і методыкі фізічнай культуры БДПУ Анатоль ДРЫГІН.

І ТРЭНЕР, І ФАЛЬКЛАРЫСТ

— Першай «іскрынкай», якая мяне «запаліла», стала інфармацыя, якую я, тады яшчэ студэнт факультэта народнай культуры БДПУ, пачуў на лекцыі, прысвечанай гульнявым традыцыям народаў Еўропы, — прызнаўся Анатоль. — Наш выкладчык кафедры этналогіі і фалькларыстыкі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт Алесь Лозка расказаў, што іспанцы хочуць, каб стральбу з рагаткі ўключылі ў праграму алімпійскіх гульняў. «Прабачце, а чаму менавіта іспанцы вырашылі «запатэнтаваць» рагатку? Чаму не мы? Напэўна, усе хлопцы майго ўзросту ў дзяцінстве прайшлі праз аналагічнае захапленне...» — прыкладна так падумаў я і пачаў даследаваць гульнявыя традыцыі беларусаў. Паехаў на Гомельшчыну, на Магілёўшчыну, каб паразмаўляць з бабулямі і дзядулямі, у тым ліку і са сваімі сваякамі, даведацца, у што яны гулялі. Звярнуўся да шматлікіх друкаваных і літаратурных крыніц. Менавіта гэта тэма лягла ў аснову майго дыпломнага праекта, а пазней народныя гульні сталі аб'ектам даследавання і ў час напісання навуковай працы ў аспірантуры. Алесь Лозка выступіў маім навуковым кіраўніком. Але я вырашыў не спыняцца і другую вышэйшую адукацыю атрымаў у Беларускім дзяржаўным універсітэце фізічнай культуры, дзе спецыялізаваўся на турысцка-аздараўленчай дзейнасці. БДПУ скончыў як выкладчык сусветнай і айчыннай культуры, кіраўнік фальклорнага калектыву, а другі дыплом у мяне — менеджара-метадыста.

Анатоль з сумам канстатуе, што такому важнаму аспекту, як масавыя народныя гулянні і спартыўныя традыцыі мінулага, пакуль што не ўдзяляецца належнай увагі. Між іншым, гульні, забавы, ігрышчы — цікавы і непаўторны момант у традыцыйнай культуры беларусаў. Гульня адлюстроўвае характар нашага народа, яго старажытныя звычаі, цесна звязана з адпачынкам, бытам і працоўнай дзейнасцю, прыродным асяроддзем краіны. Тыя ж «выбівалы» некалі былі формай фізічнай падрыхтоўкі воінаў: калі паспееш ухіліцца ад варожай зброі, значыць, застанешся падчас бою жывым. Гульня «Пекар» — гэта гульня-стратэгія, у якой да таго ж прасочваецца і пэўная, традыцыйная для беларусаў, іерархія па меры прасоўвання гульцоў наперад: пешка, кавалер, пані, кароль. Перамагае той удзельнік, хто апошні застаецца ў гульні ці займае ўзровень «кароль».

Беларусамі гульня не ўспрымалася асобна, яна пранікала ва ўсе сферы жыцця: была арганічна звязана як з абраднасцю, так і з паўсядзённасцю. Прычым у народнай культуры гульня мае больш шырокае і разнастайнае значэнне. Такія з'явы, як вечарыны, скокі, забавы, ігрышчы, карагоды, свавольствы, таксама называліся «гульнямі».

«Перацяжкі» — сілавыя спаборніцтвы з традыцыйнымі правіламі.

СТАТУТ ДЛЯ «БЕЛАРУСІЯДЫ»

Ідэя адраджэння і папулярызацыі беларускай гульнявой спадчыны моцна захапіла нашага суразмоўцу. Паступова яна ўвасобілася ў канцэпцыю спартыўна-культурнага свята «Беларусіяда». Натуральна, што эксперыментальнай пляцоўкай для правядзенння «Беларусіяды» ў 2005 годзе стаў факультэт народнай культуры БДПУ, дзе былі аб'яднаныя фальклярысты, харэографы, спартсмены, мастакі... У яе аснову былі пакладзены найбольш адметныя беларускія народныя гульні, адабраныя па прынцыпе іх распаўсюджанасці, відовішчнасці і скіраванасці на развіццё разнастайных спартыўных якасцяў. Для прыкладу, «Лапта» ўяўляе сабой актыўную і захапляльную гульню на спрытнасць і кіданне ў цэль. «Два агні» — рухальная забава з мячом, заснаваная на прынцыпе «выбівалаў». «Рыбакі» — спаборніцтвы на хуткасць. «Пацяг» і «Перацяжкі» — сілавыя спаборніцтвы з традыцыйнымі правіламі. Плюс, вядома, «Стральба» з рагаткі.

— Раней як гулялі? Так, як дамаўляліся ў пэўнай мясцовасці ці ў пэўнай вёсцы. Калі ўзяць тую ж «Лапту», то на Віцебшчыне і Магілёўшчыне гэта зусім розныя гульні, — падкрэслівае Анатоль Дрыгін. — На Беларусі можна сустрэць 5—6 відаў «Лапты». Таму для дзевяці гульняў, уключаных у праграму «Беларусіяды», мы распрацавалі дакладную сістэму правіл: колькасць і пол удзельнікаў, узроставыя абмежаванні, памеры пляцоўкі, спартыўны рыштунак, сістэму правядзення спаборніцтваў, парадак і паслядоўнасць удзелу індывідуальных гульцоў і камандаў, прынцып выяўлення пераможцаў і гэтак далей. Для арганізацыі і правядзення «Беларусіяды» быў складзены Статут, які дакладна вызначае ўсе яе палажэнні.

Медзведзяня Тосік — пастаянны талісман «Беларусіяды».

СПАРТЫЎНА-КУЛЬТУРНАЕ ШОУ

Праграма «Беларусіяды» абавязкова складаецца з двух блокаў: культурнага і спартыўнага. Першая частка праграмы ўключае ў сябе абавязковы паказ невялікай фальклорнай праграмы, заснаванай на традыцыйнай беларускай культуры, якая ў нечым нагадвае сабой кірмаш, дзе размяшчаюцца разнастайныя атракцыёны, адбываюцца выступленні артыстаў, паказальныя спаборніцтвы. Другая частка свята — спартыўная.

«Гэта правіла будзе вытрымана і падчас правядзення агульнагарадскіх спаборніцтваў сярод школьнікаў. Беларускі кірмаш быў не толькі месцам куплі-продажу, але і падзеяй, дзе просты народ меў магчымасць «адвесці душу» ў розных гульнях, спаборніцтвах, забавах на прызы, танцах, тэатры, паглядзець выступленні скамарохаў...Таму і ў нас будзе прадстаўлены і горад майстроў, і вясёлыя забавы, атракцыёны, — абяцае аўтар і ідэйны натхняльнік праекта. — А паралельна будуць адбывацца спартыўныя спаборніцтвы, падчас якіх школьнікі пазмагаюцца за выхад у фінал, а потым і за званне пераможцы. З улікам узросту гульцоў камандаў (а гэта будуць васьмікласнікі), спыніліся на чатырох гульнях: «Лапта», «Дзень-ноч», «Пальчатка» і «Перацяжкі». Каманды камбінаваныя: складаюцца з хлопцаў і дзяўчат».

Дарэчы, на падлетках «Беларусіяду» ўжо паспяхова «абкаталі». У аздараўленчым летніку «Змена», што ў Смалявіцкім раёне, педагагічны атрад «Кантакт» пад кіраўніцтвам старшага выкладчыка Марыі Бабчанок, арганізаваў, так бы мовіць, беларускія алімпійскія гульні. На цэлую змену летнік ператварыўся ў алімпійскую вёску, атрады — у краіны, а адпачывальнікі — у спартсменаў і артыстаў, якія ўдзельнічалі ў культурна-спартыўным свяце. Для назірання за правядзеннем спартыўных гульняў было створана спецыяльнае інфармацыйнае табло, на якім адлюстроўваліся ўсе вынікі спаборніцтваў, а персанал летніка меў нават сваю ўніформу з сімволікай «Беларусіяды».

А ў 2011 годзе ў праекта «Беларусіяда» з'явіўся новы пастаянны талісман — медзведзяня Тосік.

І НІЯКАГА ІНТЭРНЭТУ!

— Народныя гульні — гэта каласальная энергетыка, магчымасць аб'яднаць людзей, зацікавіць іх спартыўнай спадчынай свайго народа. Гуляючы, чалавек лёгка і непрыкметна засвойвае вобразы і сімволіку народнай эстэтыкі, — упэўнены Анатоль Дрыгін. — Досвед іншых краін паказвае, як беражліва іх народы ставяцца да сваіх нацыянальных традыцый у фізічнай культуры. Напрыклад, у Кіргізіі летась прайшлі грандыёзныя Гульні качэўнікаў. Можа, і нам трэба запачаткаваць нацыянальны спартыўна-культурны рух? **Калі мы прыйшлі ва ўстановы адукацыі, каб расказаць пра наш праект, пра будучыя спаборніцтвы, — нідзе не сустрэлі непаразумення. Хутчэй, наадварот...** Для трэнераў і настаўнікаў фізічнай культуры гэта выдатны спосаб папоўніць свой запас гульняў і забаў, якія можна выкарыстоўваць у паўсядзённай рабоце з дзецьмі. Ну а падлеткам заўсёды цікава паўдзельнічаць у чымсьці новым, плюс ім уласцівыя спартыўная канкурэнцыя і азарт. Мы ж спадзяёмся, што ўсе ўдзельнікі панясуць свае веды далей. Падчас летняга адпачынку яны падзеляцца імі з равеснікамі ў аздараўленчых летніках, у вёсцы, у сваім дварэ... І народныя гульні прымусяць дзяцей нарэшце адарвацца ад інтэрнэту!

Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@zviazda.by

У гульні «Пальчатка» галоўнае — прыдумаць стратэгію, каб перайграць саперніка.

Вяртанне да традыцый

Пояс у варажбітак забіраў сілы, а простым людзям іх даваў

У Вілейскім раённым цэнтры рамёстваў, што ў аграгарадку Ізбіно, захоўваецца віты пояс, які ўнесены ў рэестр гісторыка-культурных каштоўнасцяў Вілейшчыны. Такіх паясоў у рэгіёне засталося мала, зрэшты, як і майстрых, што валодаюць гэтым рамяством. Вілейскія варыянты тэхнік вырабу вітых паясоў могуць трапіць у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурнай нематэрыяльнай спадчыны. Ва ўсякім выпадку адпаведныя дакументы ўжо падрыхтаваны для разгляду Рэспубліканскай навукова-метадычнай радай па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны.

— У нашым рэгіёне найбольш пашыраны былі чатыры спосабы пляцення паясоў: вузламі, як у вёсцы Кішкарэпы, на прутках, як у Лядах, у чатыры пучкі, кругавыя або на дошчачцы, — адзначыла **метадыст Цэнтра рамёстваў Алена КІСЯЛЁВА**.

Беларускі пояс страціў сваё першапачатковае прызначэнне, як элемент адзення. Але ўсё больш увагі не толькі спецыялістаў, але і простых людзей прыцягвае як мастацкі твор. У Вілейскім цэнтры рамёстваў ёсць супрацоўнікі, якія засвоілі тэхніку вырабу паясоў. Яны дзеляцца сваім уменнем з дарослымі і дзецьмі, ладзяць пазнавальныя праграмы па гісторыі стварэння традыцыйных для гэтай мясцовасці паясоў.

Беларускі пояс страціў сваё першапачатковае прызначэнне, як элемент адзення. Але ўсё больш увагі не толькі спецыялістаў, але і простых людзей прыцягвае як мастацкі твор.

Паясы для нашых продкаў былі не толькі элементам упрыгажэння, але і своеасаблівым абярэгам ад злых сіл, няшчасных выпадкаў і хвароб.

Лічылася, што кожны прыстойны чалавек павінен быць падпразаны поясам. Выйсці без яго ў людзі — значыць, паказаць непавагу да іншых. А вось вядзьмаркі, знахаркі, варажбіткі пояс не насілі, паколькі ён, згодна з народным павер'ем, забіраў чароўныя сілы.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.
lazovskaya@zviazda.by

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск №17 (364)

■ Будзем знаёмыя

МАЛЮНКІ ЯК КРЫНІЦА ПАЗІТЫВУ,

або Асяроддзе, здольнае выхоўваць і натхняць

На сценах сталічных будынкаў усё часцей можна пабачыць розныя малюнкі: пазітыўныя каты, совы, партрэты... Вялікія муралы выклікаюць неадназначную рэакцыю гараджан: нехта захапляецца майстэрствам айчынных і замежных мастакоў, а нехта не прымае іх светапогляду. А вось да пазітыўных малюнкаў Наталлі КАРПУШЫНАЙ, якімі яна ўпрыгожвае дамы на сваёй вуліцы, усе ставяцца толькі станоўча. Міні-мульцік пра чалавечка, які «змагаецца» з цяжкімі блокамі, сабачка на сцяне ветэрынарнай клінікі, малюнак Залатога Горада з вядомай песні, якім яна аздобіла ўласны пад'езд. Раней рабіла лялек у падарунак сябрам і свайкам, сёння пад заказ размалёўвае сцены ў кватэрах, кабінетах, афармляе групы дзіцячых садкоў, а для душы — робіць прыгажэйшымі аднастайныя і змрочныя сцены дамоў... і марыць пра тое, каб у яе вуліцы з'явіўся свой брэнд.

А пачыналася ўсё так:

— Калі заходзіш у наш дом, то адразу бачыш сцяну, — дзеліцца Наталля Карпушына. — Яна — як тупік. Мне ж заўсёды хацелася «прабіць» гэты тупік. Доўга думала, як гэта можна зрабіць, што лепш намаляваць. Тады прыгадала песню Барыса Грабеншчыкова пра Го-

«Калі мы бачым прыгожы інтэр'ер, гэта нас мабілізуе, прымушае адпавядаць, уплывае на далейшае жыццё».

рад Залаты і вырашыла выкарыстаць яе сюжэт, намаляваць нейкую мару. Пакуль працавала, суседзі на мяне пазіралі з цікавасцю, а калі работа ўжо была скончаная, суседка стала на ўваходзе і сказала: сёння ўваход у пад'езд платны. Усе заходзілі і плацілі грошы — так я вярнула сродкі, затрачаныя на фарбы. З таго дня суседзі сталі вітацца, сачыць за чысцінёй у пад'ездзе. Самае прыемнае — прасілі і на іншых паверхах нешта намаляваць. Сусед папрасіў, каб я намалявала букет для яго жонкі — каб яна бачыла кветкі кожны раз, калі выходзіць з кватэры. Мне вельмі спадабалася, што суседзі паставіліся да маёй ініцыятывы добразычліва.

З гэтай прычыны мастачка вырашыла аздобіць не толькі ўласны пад'езд, але і нейкім чынам ажывіць дамы на сваёй вуліцы.

— У нас з'явіўся сабака, таму часам даводзілася хадзіць у ветэрынарную клініку, каб зрабіць яму прышчэпкі, — распавядае спадарыня Наталля. — Будынак клінікі мне падаўся змрочным, таму прапанавала кіраўніцтву нешта на ім намаляваць, каб трохі ўпрыгожыць. Тым больш, гэтую клініку складана адразу знайсці, і многія часта запытваюцца дарогу ў мясцовых. Таму я вырашыла, што ўпрыгожванне стане і выдатным арыенцірам для наведвальнікаў.

Наталля Карпушына прызнаецца, што спачатку баялася рэакцыі мінакоў, суседзяў. Думала, што яны негатыўна паставяцца да такой ініцыятывы:

— Для малявання выбрала дзень, каб на вуліцы было менш людзей. Прачнулася а 6-й гадзіне раніцы. Калі работа падыходзіла да канца, я пачула крокі ззаду, спалохалася. Абярнуўшыся, пабачыла жанчыну, якая ішла з крамы з вялікімі пакетамі. Яна іх проста апусціла на зямлю і сказала: дзякуй вам вялікі, гэта будзе не проста звычайны дом, а ўпрыгожаны малюнкам. Гэта мяне вельмі натхніла. Таму вырашыла працягнуць справу.

Мастачка прыдумала маленькі мульцік пра чалавечка, які малявала, выкарыстоўваючы прамавугольныя «латкі» — надпісы, замаляваныя фарбамі. Гэтым разам, па яе словах, пачувалася смялей, работу таксама пачала зранку, але ўжо да 12 гадзін была вельмі шчаслівая, бо ўсе мінакі радаваліся, дзякавалі. Нават апладзіравалі. Таму зразумела, што справу варта працягваць: людзям гэта падабаецца. А потым пачалі адбывацца цуды.

— Малюнкі на дамах я рабіла толькі для сябе, дзеля ўласнага задавальнення. Але неяк на адным з сайтаў у інтэрнэце пабачыла матэрыял пра майго чалавечка, дзе пісалі, што шукаюць аўтара. Я адгукнулася — і ўсё ў маім жыцці пачало хутка змяняцца. З'явіліся новыя сябры, я даведалася, што мяне шукае рэжысёр, які збірае матэрыял для кіно пра стрыт-арт у Мінску. Мы пасябравалі. Хутка ўжо пачнуцца здымкі.

Ёсць нават больш глабальная ідэя зрабіць чалавечкаў, прыдуманых Наталляй, сімвалам вуліцы, магчыма, наладзіць выпуск нейкіх сувеніраў з гэтымі выявамі.

А як прыходзіць разуменне, што на доме павінен з'явіцца менавіта такі малюнак? — пытаюся.

— Усё адбываецца ў працэсе. У мяне не атрымліваецца адразу зразумець, што варта намаляваць у пэўным месцы. Некаторы час хаджу, прыглядаюся, думаю. Само выкананне работы займае не так шмат часу: я малюю хутка. Галоўнае — падрыхтоўка, ідэя.

Дарэчы, малюнкі Наталлі можна пабачыць не толькі на дамах звонку, імі ўпрыгожаны розныя памяшканні, але больш за ўсё, як прызнаецца мастачка, ёй падабаецца аздабляць групы ў дзіцячых садках.

«Сусед папрасіў, каб я намалявала букет для яго жонкі — каб яна бачыла кветкі кожны раз, калі выходзіць з кватэры».

— Калі прыводзіла сваіх дзяцей у дзіцячы садок, то вельмі непрыемныя адчуванні ўзнікалі, калі бачыла паламаных лялек у пацёртым адзенні, хацелася іх пераадзець. Бачыла дзіўныя безгустоўныя стэнды і адразу іх хацела перарабіць, — кажа Наталля. — Часам даводзілася ратаваць групы, садкі, якія былі пафарбаваныя ў цёмныя колеры. Такая праца — кожны раз нешта новае, цікавае. Цікава ўвасабляць ідэі выхавальнікаў, загадчыц. Напрыклад, неяк паводле агульнай задумкі зрабілі першы ў Мінску сэнсарны пакой, дзе можна займацца з дзецьмі. Заўсёды кіравалася такім прынцыпам: мае дзеці ходзяць у садок, яны там праводзяць большую частку дня. Значыць я павінна дапамагаць садку — мая дапамога гэта нейкая частка ўдзелу ў іх выхаванні. Таксама разумею, што выхоўваць можна не толькі словам, учынкам, але і асяроддзем, у якім знаходзяцца дзеці. Калі мы бачым прыгожы інтэр'ер, гэта нас мабілізуе, прымушае адпавядаць, уплывае на далейшае жыццё. Часам я нават не паспяваю скончыць работу, а выхавальнік ужо пачынае працаваць з выкарыстаннем гэтых малюнкаў. Цікава і назіраць за дзецьмі: пакуль я працую, яны глядзяць на мяне, як на цуд. І я ведаю, што гэта застанецца ў іх свядомасці, магчыма, паўплывае на выбар жыццёвай дарогі. Бывае, бацькі нават цікавяцца: а малюнкі не знікнуць, не сатруцца?

Як адзначае сама мастачка, ёй заўсёды цікава назіраць за тым, як вобразы літаральна нараджаюцца ніадкуль.

— Мяне вельмі натхняе праца, жаданне стварыць нешта новае, не паўтарацца, — кажа яна.

Марына ВЕСЯЛУХА.
vesialuha@zviazda.by

Больш фота на сайце zviazda.by.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Падзея

ГРАВЮРЫ, НА ЯКІХ ЗАРАБЛЯЎ РЭМБРАНТ

Галандскі класік уласнай персонай у Мінску

У Нацыянальны мастацкі музей «прыехаў» Рэмбрант — адзін з найвядомейшых галандскіх мастакоў, прадстаўнік залатога перыяду галандскага жывапісу, які прыпаў на XVII стагоддзе, «другі Рубенс», аўтар «Начной варты» і нарэшце знакаміты афартыст. Менавіта гравюры і сталі асновай выстаўкі «Вялікі Рэмбрант», якая трапіла ў Беларусь з італьянскай прыватнай калекцыі Элізы Марэці. Экспазіцыя пачала працаваць учора.

Аўтапартрэт з Саскіяй. 1636
Афорт

Арганізацыя ў Беларусі выставак непераўзыдзеных майстроў такога кшталту, чые імёны сталі амаль што хадзячай назвай, творы якіх берагуцца як зрэнка вока, ацэньваюцца як бясцэнныя і перакупляюцца за шалёныя грошы, забяспечваюць статус калекцый, — у пэўным сэнсе сенсацыя для нашай маленькай культурнай прасторы.

Вандроўкі работ класічных жывапісцаў — справа нячастая, таму што патрабуюць вялікіх намаганняў, грошай і нясуць рызыку для цэласці каштоўнага экспаната. Агульная практыка — гэта калі Магамет ідзе да гары, то-бок зацікаўлены едзе ў замежжа і наведвае музеі, дзе выстаўляюцца арыгіналы. Але ж і ракіроўкі паміж краінамі таксама існуюць як, можна сказаць, рух. Мінулым летам рэзананс выклікала дэманстрацыя «Алімпіі» Эдуарда Манэ, што захоўваецца ў парыжскім музеі Арсэ, у Венецыі, Маскве і Санкт-Пецярбургу, пры тым, што раней карціна выязджала за межы Парыжа толькі аднойчы.

Больш актыўна перамяшчаюцца менш знакамітыя і папулярныя работы легендарных творцаў. Напрыклад, у 2015 годзе ў сталічнай галерэі «Дом карцін» была арганізавана выстаўка графічных работ Сальвадора Далі, Анры Маціса і Марка Шагала. Часта такога кшталту праекты з'яўляюцца цэлымі гастролямі, дзе Беларусь становіцца адным з пунктаў прыпынку. У гэтых умовах варыянт знаёмства гледача з класікамі — выстаўкі рэпрадукцый, якія праводзяцца і ў Мінску, як, напрыклад, нядаўняя экспазіцыя «Густаў Клімт. 100 гадоў без генія» ў «Galleria Minsk».

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Вось чаму выстаўленне ў Мінску арыгінальных афортаў Рэмбранта, жывапісца XVII стагоддзя, з'яўляецца выключнай падзеяй, тым больш што за межамі Галандыі мастак заўсёды быў больш вядомы як гравёр (на гэтай рабоце ён зарабляў нядрэнныя грошы). Дарэчы, у гэтым кантэксце Нацыянальны мастацкі музей перыядычна выступае з прынаднымі мерапрыемствамі. Год таму тут былі выстаўлены арыгінальныя гравюры Франсіска Гоі і Пабла Пікаса.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.
katsyalovich@zviazda.by

■ Літаратура

ФРАНЦЫСК СКАРЫНА ЯК ІНДЫКАТАР САМАСВЯДОМАСЦІ

500 гадоў беларускаму кнігадрукаванню
НАПАЧАТКУ БЫЛО СЛОВА

Ролю першадрукара ў фарміраванні беларускай ідэнтычнасці прааналізавалі падчас прэзентацыі новай кнігі.

Кнігу «Францыск Скарына. Са слаўнага горада Полацка» прэзентавалі ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. У выданне, створанае дзякуючы супольнай працы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і выдавецтва «Мастацкая літаратура», увайшлі нарысы і артыкулы Усевалада Ігнатоўскага, Вацлава Ластоўскага, Максіма Гарэцкага, Кандрата Крапівы, Уладзіміра Караткевіча, Алеся Адамовіча ды іншых вядомых беларусаў, прысвечаныя постаці Францыска Скарыны. Тэксты змешчаныя ў чатырох раздзелах («Дзеі Скарыны», «Слова Скарыны», «Слава Скарыны», «Сусвет Скарыны»), каб ахапіць асноўныя моманты жыцця і творчасці першадрукара.

— Кніга «Францыск Скарына. Са слаўнага горада Полацка» пабачыла свет, дзякуючы цэламу стагоддзю намаганняў беларусаў: вучоных, журналістаў, палітыкаў, грамадскіх і царкоўных дзеячаў, якія так ці інакш працавалі над вобразам, успрыманнем і разуменнем першадрукара, — расказаў **укладальнік кнігі, намеснік дырэктара па навуковай рабоце і выдавецкай дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Алесь СУША.** — Скарына — рукатворны вобраз. Бронзавая скульптура на ўваходзе ў Нацыянальную бібліятэку — гэта тое, што знаходзіцца ў галовах беларусаў, што мы разумеем пад Францыскам Скарынам, а не тое, чым ён насамрэч з'яўляўся. Сёння беларусы пачынаюць іначай глядзець на саміх сябе, мяняюцца сродкі рэпрэзентацыі нацыянальнай культуры, і паступова ўзнікае новая форма разумення Скарыны.

Хто такі Францыск Скарына? Першадрукар, асветнік, гуманіст, доктар медыцынскіх навук, славуты выпускнік Падуанскага ўніверсітэта і... зусім невядомая асоба. У нейкім сэнсе ён стаў лакмусавай паперкай беларускасці — постаць першадрукара ўзнялася на паверхню з глыбіні гісторыі толькі ў 1909 годзе. Да таго часу — некалькі стагоддзяў маўчання. Алесь Суша прызнаецца, што для яго стала адкрыццём тое, што беларусы фактычна стварылі Скарыну, калі пачалі звацца беларусамі, казаць пра сваю нацыянальную адметнасць і самабытнасць, змагацца за права быць нацыяй і мець асобную дзяржаўнасць. Кніга «Францыск Скарына. Са слаўнага горада Полацка» прэзентуе чытачам не проста асобу першадрукара, а тое, як праз вобраз Францыска Скарыны канструявалася цэлая нацыя.

Калі на пачатку XX стагоддзя беларусы звярнуліся да Скарыны, аднавіць яго жыццё і творчасць дапамаглі раннія публікацыі замежных даследчыкаў — расійскіх, польскіх, чэшскіх, нямецкіх, літоўскіх ды іншых. Дарэчы, юбілей нашага першадрукара ўнесены ў Каляндар памятных дат ЮНЕСКА і шырока адзначаецца не толькі ў Беларусі. Так, 4 мая ў Вільні пачалося еўрапейскае турнэ міжнароднага выставачнага праекта «Дарогамі Скарыны з Белгазпрамбанкам». У Нацыянальным музеі «Палац вялікіх князёў літоўскіх» літоўцы ўпершыню сустрэнуцца з арыгіналам «Малой падарожнай кніжкі», надрукаванай Францыскам Скарынам у 1522 годзе ў Вільні, і кнігай «Іоў», вылучанай для ўдзелу ў праекце са збору Нацыянальнай бібліятэкі. Акрамя кніжных экспанатаў, для еўрапейскага гледача падрыхтаваны дакументальны фільм пра жыццё і творчасць Францыска Скарыны, а таксама падарожжа ў майстэрню друкара пры дапамозе шлема віртуальнай рэальнасці.

Прэзентацыя кнігі «Францыск Скарына. Са слаўнага горада Полацка» таксама не абышлася без інтэрактыву. Ідэю выдання ў новай ды арыгінальнай форме прадэманстравала жартоўнае анімацыйнае відэа, дзе агучылі думкі сучасных беларусаў пра Францыска Скарыну.

— Даследаванні, прысвечаныя першадрукару, пачаліся 100 гадоў таму, ідуць зараз і працягнуцца заўтра. Будзе яшчэ шмат кніг пра Францыска Скарыну, бо ён — легенда, наша ява і будучыня, — кажа **паэт, празаік, галоўны рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Віктар ШНІП.** — Алесь Суша знайшоў шмат цікавых матэрыялаў, і нам давялося выбіраць, што з іх надрукаваць у кнізе. У выніку атрымалася цудоўнае выданне, непаўторнае па змесце і афармленні.

Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ

■ Уласны погляд

ПА ПРАВЕ ТЭАРЭТЫКА,

альбо Як зразумець Эдуарда Ханка?



Нечаканы скандал узварухнуў ціхую паверхню чысцюткага возера беларускай эстрады. Хвалі — узрушэння ці абурэння (ці за адзін ці за другі бок) — пайшлі далёка, атрымалі рэзананс: Ханок супраць выкарыстання яго песень САМЫМІ тытулаванымі сёння айчыннымі артыстамі... Сапраўды дзіўна: усе ж нашы, і такія блізкія, харошыя людзі. І Ядзвіга Паплаўская ў складанай, вельмі эмацыянальнай сітуацыі, у якой немагчыма ёй не спачуваць, і немагчыма не зразумець: той вечар, калі гучалі песні дзеля ўспамінаў пра Аляксандра Ціхановіча, для яе быў больш, чым выступленне на сцэне (магчыма, таму яна ўпусціла фармальнасці, звычайныя для канцэрта?). Гэта быў вечар-ВЯЧЭРА, на саракавіны, куды запрасілі сяброў. І ўсе гэта зразумелі...

Прынцыпова не пагадзіўся зразумець Эдуард Сямёнавіч: ён-та прысутнічаў на канцэрце. З фармальнага боку гэта так. І з фармальнага боку свяшчэннае аўтарскае права — найвышэй за ўсё. За людзей, якія жывыя, і ім баліць; за тых, якіх ужо няма, і якім, успомніўшы нашага самага маральнага пісьменніка Васіля Быкава, ужо не баліць. Тады, калі мы чыталі гэтую аповесць, то разумелі, што па-чалавечы, а што — не. І як жа разумець, чаго сапраўды хоча Эдуард Сямёнавіч, таму што сам ён то нагадвае пра фінансавыя абавязкі спевакоў, то яго нібыта «грошы не цікавяць», ён толькі за справядлівасць, незалежна ад цаны пытання. Таму што ў канцэрце сапраўды героі — не толькі артысты, але і аўтары песень. Але і Ядзвігу Паплаўскую зразумець можна: калі б гучала шмат імёнаў, то за імі згасла б тое імя, дзеля якога яна ўсё гэта арганізавала.

І Эдуарда Ханка зразумець можна не толькі з пункту гледжання Канстытуцыі і аўтарскага права. Бо Эдуард Сямёнавіч — больш, чым кампазітар. Справа не столькі ў яго высокай, вельмі высокай музычнай адукацыі, якую ён атрымаў у Маскоўскай кансерваторыі: такая адукацыя давала падставы ствараць маштабныя музычныя творы, але ён аддаў перавагу таму, каб ствараць песні. Хіты. Іх спявалі топ-артысты СССР, адна Пугачова чаго вартая. Яны вельмі хутка (на дзіва, значна хутчэй, чым маштабныя акадэмічныя творы) прыносілі славу аўтару.

Паводле таго, як жылі, як доўга трымаліся яго хіты на піку папулярнасці, кампазітар прыйшоў да разумення законаў, якім падпарадкоўваецца шоу-бізнес — савецкі ці сусветны. Эдуард Ханок прапанаваў уласную «тэорыю хваляў», якую абгрунтаваў на прыкладзе савецкіх артыстаў, з якімі быў знаёмы і за творчасцю якіх назіраў.

Крыху больш за 20 гадоў таму на старонках «Звязды» мы ўпершыню звярнуліся да «тэорыі хваляў» Эдуарда Ханка. Сам аўтар тлумачыў законы папулярнасці, з канкрэтнымі прыкладамі. Самым яскравым прыкладам для яго стала якраз Ала Барысаўна, чыя папулярнасць, на думку тэарэтыка, стала зніжацца. На думку аўтара тэорыі, пяць-шэсць гадоў можна пратрымацца на піку хвалі — і пачынаецца спад, цікавасць зніжаецца і чалавека наогул могуць забыць. І тады патрэбныя іншыя нагоды, каб узняць чарговую хвалю: пластычныя аперацыі, пра якія гаворыць уся краіна, новыя мужы, якіх абмяркоўваюць... Ды што там казаць, любы скандал, згодна з тэорыяй Ханка, здольны ўзняць новую хвалю цікавасці да артыста, пасля чаго ў яго зноў канцэрты, гастролі, заробкі...

Тэорыя Ханка мела рэзананс. Ён яе папулярна выклаў напрыканцы 90-х гадоў у кнізе і пасля з'яўлення «Пу-га-чоў-шчы-ны!» здолеў прыцягнуць цікавасць ужо да сябе, стаў запатрабаваным, нават у Маскве. Было шмат інтэрв'ю, сустрэч, дзе Эдуард Ханок тлумачыў сутнасць свайго вынаходніцтва, атрымаўшы... сваю хвалю папулярнасці на былой вялікай постсавецкай прасторы.

Яна пайшла на спад, відаць, тады, калі пакрыўджаная Пугачова запатрабавала публічнага прабачэння ад Ханка, які для яе быў найперш кампазітарам, аўтарам некалькіх песень, што сталі папулярнымі ў яе выкананні. І тут інтарэс быў узаемны: гэта гонар, калі першая спявачка краіны бярэ для выканання твае песні.

Эдуард Сямёнавіч насамрэч і гэта выдатна разумее: шмат што ў поспеху песні залежыць ад артыста — яго вакальных якасцяў, таленту, харызмы. Але той момант, калі выканаўца забяспечвае папулярнасць і вядомасць кампазітару, аўтарскае права не адлюстроўвае. А тут не ўсё так проста. Бо нават у некаторых песень Ханка было па некалькі выканаўцаў, але толькі адзін з іх змог ператварыць твор у шлягер. Напрыклад, «Зіма» стала папулярнай дзякуючы Эдуарду Хілю (хоць спявалі яе і іншыя), а песня «Здравствуй, чужая милая» нібыта чакала Аляксандра Саладуху. Ды ў адным інтэрв'ю сам Эдуард Ханок прызнаваўся, што «Жураўліка» ды «Песню першакласніка» сама Пугачова «на яго вачах зрабіла» — у тым выглядзе, у якім гэтая песня прыйшла да слухачоў. Ды і тое ж у дачыненні да славутай «Малінаўкі», ці вось яшчэ цытата Ханка з інтэрв'ю наконт песні «Вы шуміце, шуміце, нада мною бярозы», які ў яе быў бы лёс: «Калі б яна не спадабалася салісту «Сяброў» Анатолю Ярмоленку, які давёў яе да розуму...» Але гэта Эдуард Ханок казаў, калі ўжо палічыў, што перарос прафесію кампазітара і стаў тэарэтыкам (і жыў гэтым).

Але адпрацаваная тэорыя ўжо адпрацавалася. Прайшоў час... Жыццё такое: часам прыходзіцца вяртацца ў мінулае і зноў лічыць сябе найперш кампазітарам. Актыўна нагадваць пра гэта, сцвярджаючы правы кампазітара (якія не надта хвалявалі тэарэтыка).

Новая хваля?

Ларыса ЦІМОШЫК.
tsimoshyk@zviazda.by

■ Ініцыятыва

БЕЛАРУСЫ ЧЫТАЮЦЬ?

Завяршыўся першы этап праекта movabox

У ліку прычын, чаму яны не чытаюць кнігі, многія беларусы называюць няведанне. Няведанне імёнаў сучасных аўтараў, месцаў, дзе знайсці новыя выданні, ды і ў цэлым скептычнае стаўленне да нашай літаратуры, сумненні, што твор на беларускай мове можа сапраўды захапіць. І праўда, спецыялісты адзначаюць, што ў нашай краіне, каб сустрэцца з кнігай, патэнцыйны чытач павінен быць прынамсі зацікаўлены ў гэтым, матываваны да набыцця ці хоць бы ахвочы пазычыць выданне ў сябра. Таму, каб арганізаваць «знаёмства» шырокай публікі з сучаснай беларускай літаратурай, разнастайнымі кнігамі, кампанія velcom паўгода таму распачала праект movabox.

Цягам шасці месяцаў чытачы знаёміліся з кнігамі — удзельнікамі праекта. Яны атрымалі магчымасць стацца сведкамі прыгод Пранціша Вырвіча, здзейсніць вандроўку па казачным лесе разам з «Дзецьмі Аліндаркі», пабыць хуліганамі, пачытаўшы вершы са зборніка «Дзяцел і дупло» і заглыбіцца ва ўласны космас праз кнігу «Радзіва «Прудок». Некаторыя шчасліўчыкі мелі шанц займець скрынкі з артэфактамі, а некаторыя — асабіста пазнаёміцца з любімымі аўтарамі. У межах праекта адбылася таксама дыскусія пра сучасную беларускую дзіцячую літаратуру, а ў кавярнях сталіцы і сямі іншых гарадоў краіны былі ўстаноўленыя скрынкі для бясплатнага беларускамоўнага буккросінгу, напоўненыя кнігамі сучасных айчынных пісьменнікаў.

Як адзначыў падчас заключнай імпрэзы **кіраўнік аддзела брэндменеджменту кампаніі velcom Зміцер КУРЛОВІЧ,** за час рэалізацыі праекта спецыяльны сайт наведала каля 50 тысяч чалавек. Больш за 20 тысяч прайшлі адмыслова распрацаваныя тэсты па кнігах. На кожную скрынку movabox, што змяшчае артэфакты, звязаныя з сюжэтам выданняў — удзельнікаў праекта, прэтэндавала каля 110 чалавек, якія пакінулі свае кантакты для сувязі.

Кожны з пісьменнікаў — удзельнікаў праекта таксама атрымаў новы вопыт узаемадзеяння з публікай. Нехта адзначыў нечаканасць новага «ўвасаблення, апрадмечвання» твора ў скрынках movabox, хтосьці палічыў праект і яго шырокі грамадскі рэзананс доказам таго, што і ў сучаснай Беларусі праца пісьменніка не марная. Але ўсе пагадзіліся з адным: праект яшчэ раз пацвердзіў, што наша літаратура жыццяздольная, паўнавартасная і цікавая. Варта толькі паказаць чытачу шлях да кнігі, зрабіць больш шырокай і даступнай інфармацыю пра яе.

Дарэчы, на гэтым movabox не развітваецца з чытачамі. Скрынкі для буккросінгу час ад часу будуць папаўняцца новымі выданнямі, а атрымаць параду пра кнігу, якую варта было б прачытаць, можна дзякуючы новаму сэрвісу movabot, што працуе пры падтрымцы сайта kniharnia.by.

Свой вынік фотапастка дае і пры назіранні за дзікімі жывёламі, дапамагае папярэджваць выпадкі засмечвання лясоў і крадзяжу прадукцыі. Зараз у лясгасе 6 такіх фотапастак. Між тым, тут падумваюць аб набыцці квадракоптара, з дапамогай якога можна было б назіраць за насаджэннямі зверху.

Лягчэй будзе выяўляць і лясныя пажары. Сёлета пажаранебяспечны перыяд пачаўся ўжо ў сакавіку.

— Мы своечасова правялі прафілактычныя мерапрыемствы, зрабілі мінералізаваныя палосы, — канстатуе Вадзім Станько. — Шмат шкоды могуць прычыніць лесу сельскагаспадарчыя палы. Мы выяўляем небяспечныя зоны яшчэ да таго, як прыйдзе бяда. Тыя ж мінералізаваныя бар'еры ствараем, дзе палі прымыкаюць да ляснога фонду. Сёлета ўсё было аператыўна праведзена, і мы не дапусцілі лясных пажараў.

На карысць лясной справе і мадэрнізацыя, якая праводзіцца ў лясгасе. Для ўмацавання лясоў ад пажараў тут набылі новую пажарную машыну і дзве машыны для падвозу вады. Праведзена таксама мадэрнізацыя гадавальніка. Устаноўлены новыя цяпліцы для вырошчвання саджанцаў па фінскай тэхналогіі. Гэты метад дазваляе паменшыць тэрмін вырошчвання пасадачнага матэрыялу часам у некалькі разоў. І ў маленькіх дрэўцаў амаль 100-працэнтная прыжывальнасць.

Тэхніка для падвозу вады.

ЛЯСНЫЯ ШКОЛЫ

Для любога лясгаса справа гонару выхаваць сабе змену. І Бабруйскі лясгас не выключэнне. На базе Брожскага, Любоніцкага і Глушанскага вопытна-вытворчага лясніцтваў працуюць тры так званыя лясныя школы.

— Гэта своеасаблівыя біялагічныя гурткі, якія арганізаваны ў школе, — тлумачыць Вадзім Станько. — Дзеці там займаюцца па спецыяльнай праграме, накіраванай на экалагічнае развіццё. У іх праходзяць тэарэтычныя і практычныя заняткі, яны наведваюць лясныя масівы, наводзяць там парадак, дапамагаюць саджаць новыя дрэвы, навешваць гняздоўі. Спадзяёмся, што гэтыя дзеці ў будучыні выберуць прафесію лесавода.

Галоўны ляснічы Вадзім СТАНЬКО.

Прафесія, дарэчы, добрая і перспектыўная. Цяпер драўніна цэніцца ва ўсім свеце. І для Бабруйскага лясгаса асноўныя даходы прыносіць рэалізацыя драўніны на экспарт і ўнутраны рынак. Ёсць лесанарыхтоўчы ўчастак для распрацовак лесасек і цэх лесаперапрацоўкі. Там вырабляюцца ацыліндраваная драўніна, піламатэрыялы, адкрыта новая брыкетная лінія. Экспарт лясной прадукцыі ажыццяўляецца ў 19 краін свету.

Дырэктар ДЛГУ «Бабруйскі лясгас» Андрэй ЦВІРКО:

«Лес заўсёды быў і застаецца для чалавека крыніцай не толькі матэрыяльных, але і духоўных каштоўнасцяў. Праца бабруйскіх лесаводаў абнаўляе і паляпшае наш цудоўны край. У гэтую прафесію нельга прыйсці без прызвання. Мы ствараем прыгажосць для нашых нашчадкаў. Спадзяёмся, што яны застануцца нам за гэта ўдзячныя».

НАВЕДАЙЦЕ НАШЫ СЛАВУТАСЦІ

Уладанні Бабруйскага лясгаса займаюць амаль 128 гектараў тэрыторыі Бабруйскага і Кіраўскага раёнаў. І такіх унікальных куточкаў прыроды, якія існуюць тут, вы не знойдзеце нідзе. Чаго толькі варты помнік прыроды рэспубліканскага значэння «Участак лесу з каштоўнымі дрэвавымі пародамі», размешчаны на тэрыторыі Стайкаўскага сельскага Савета Кіраўскага раёна. Тут растуць такія рэдкія пароды, як сасна Веймутава або штучна створаная яшчэ ў 1884 годзе лістоўніца. Вельмі прывабны для турыстаў Дубаўскі каскад азёраў, дзе 4 возеры злучаны паміж сабой адной ракой.

Спартсмен і кіраўнік базавага гадавальніка Аляксандр ЖУРАЎЛЁЎ.

— Мы дадаткова распрацавалі турыстычны маршрут працягласцю 20 кіламетраў са стварэннем экапаляны, стаянкай на Чыгірынскім вадасховішчы, з наведваннем рэспубліканскага помніка прыроды — чыгірынскага насаджэння і мемарыяльнага комплексу памяці спаленых вёсак у вёсцы Боркі, — расказвае галоўны ляснічы. — Акрамя гэтага, створаны пешы экалагічны маршрут і веласіпедная сцежка з апісаннем участкаў, розных насаджэнняў. Маршрут прадуманы так, каб чалавек змог самастойна наведаць лясныя прыгажосці. Магчыма, пасля такой экскурсіі камусьці захочацца адпачыць на нашай паляўнічай базе. У нас камфартабельнае жыллё, і ўсе маршруты пачынаюцца менавіта з паляўнічага комплексу. Там устаноўлены карты і ёсць паказальнікі. Так што заблудзіць немагчыма.

Матэрыялы падрыхтавалі Нэлі ЗІГУЛЯ, Святлана СУШКО, Вольга ГЕЦЭВІЧ. Фота Нэлі ЗІГУЛЯ і з архіва прадпрыемстваў.

УНП 700108599

■ Гісторыя газеты — гісторыя краіны

ПЕРШЫЯ СВЯТЫ І ПЕРШЫЯ СТРАТЫ «ЗВЯЗДЫ»

Сённяшняя «Звязда» ў далёкім 1917 годзе рыхтавалася да выхаду як доўгачаканая зброя мясцовых бальшавікоў у іх барацьбе за ўладу, у першую чаргу, на Заходнім фронце. У красавіку 1917-га ў Мінску праходзіў франтавы з'езд салдат, на якім прагучаў заклік аб неабходнасці выдання «рэвалюцыйна-дэмакратычнай газеты». Яго падтрымаў прадстаўнік ЦК РСДРП(б) В. Нагін. Звесткі аб адлічэнні ў сакавіку 1917 года рабочымі шпалернай фабрыкі грошай на выданне «Звязды» нельга лічыць праўдзівымі з-за адсутнасці пацвярджэнняў. Неабходная сума (2000 руб.) была выдадзена мінскім бальшавікам з касы ЦК РСДРП(б) адразу пасля вяртання Уладзіміра Леніна з-за мяжы.

Міхаіл Васільевіч Фрунзэ (1885 — 1925). Рэдагаваў «Звязду» ў жніўні 1917. Нечакана памёр у час нескладанай аперацыі ў 1925 годзе.

Мінск у пачатку 1917 года нагадваў старажытны горад Вавілон. Тут у розных яго частках, як цэнтральных, так і перыферыйных, з восені 1915-га (час захопу часткі тэрыторыі Беларусі немцамі — кайзераўцамі) размяшчаліся штаб Заходняга фронту, армейскі, па раскладзе ваеннага часу, гарнізон, мясціліся, нібы ластаўчыны гнёзды, установы Усерасійскага земскага саюза, Усерасійскага саюза гарадоў, Чырвонага Крыжа, бежанскія камітэты, іншыя шматлікія, не патрабавальныя да ўмоў існавання спадарожнікі вайны. У губернскім Мінску ў той перыяд пражывала калі 250 тыс. чалавек: беларусы, рускія, палякі, яўрэі, татары, прадстаўнікі іншых нацыянальнасцяў. Сацыяльная актыўнасць належала рабочым і салдацкім масам.

Некаторыя гісторыкі паведамляюць аб нібы слабай зацікаўленасці беларусаў у сваёй нацыянальнай ідэнтыфікацыі. Але гэта не перашкаджала ім цікавіцца нацыянальнай праблематыкай, беражліва адносіцца да сваёй мовы, культуры. Вясковыя настаўнікі, аграномы, заатэхнікі, ветэрынары, іншыя прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі вылучалі ў дзяржаўныя органы ўлады канкрэтныя і слушныя прапановы па паляпшэнні становішча беларускай нацыі. Можа, з гэтай прычыны ў Беларусі ў пачатку XX стагоддзя актывізавалася выданне газет.

Матывы і абставіны ўзнікнення любой газеты заўсёды прыцягваюць увагу чытача. «Звязда» — не выключэнне. Яе першыя нумары хацелі нават у 1932 годзе перавыдаць, каб яшчэ раз праліць святло на першапачатковы перыяд яе існавання. Цікавяць людзей іншыя гады. Большасць дакументаў знаходзіцца ў Нацыянальным архіве, у яго састаўной частцы — Цэнтральным партыйным архіве. Гэта: надрукаваныя на машынцы ці напісаныя ад рукі дакументы рэдакцыі, партыйныя пастановы, пратаколы пасяджэнняў рэдакцыйнай калегіі, сходаў працоўнага калектыву, звароты са скаргамі да ўрада ў час сталінскіх рэпрэсій, шматлікія лісты чытачоў, бухгалтарскія і іншыя справаздачы... Названае — своеасаблівае люстэрка гісторыі беларускай краіны.

Спрэчкі аб ролі асобы ў гісторыі не дзіўныя, а заканамерныя. У пэўным аб'ёме на гэты конт мела месца дыскусія і ў «Звяздзе» пры вызначэнні галоўнага рэдактара. Існаванне Мінскага камітэта РСДРП(б) адыгрывала ў гэтым пытанні галоўную ролю. Лічылася, што яго кіраўнік А.Ф. Мяснікоў — асноўны прэтэндэнт на разглядаемую пасаду. Але побач былі і такія яркія асобы, як М.В. Фрунзэ, К.І. Ландар, В.В. Фамін, якіх таксама можна лічыць першымі галоўнымі рэдактарамі газеты.

Выхад першага нумара быў прымеркаваны да 30 ліпеня — дня выбараў у Мінскую гарадскую думу. Газета ўбачыла свет напярэдадні — 27 ліпеня 1917 года па старым стылі, або 9 жніўня 1917 года па новым. Мінскія бальшавікі не толькі прайшлі ў думу, але і паспяхова зацвердзілі там дэкларацыю аб органах мясцовага самакіравання як цэнтры барацьбы за спыненне ваенных дзеянняў. 9 жніўня стала днём нараджэння старэйшай цэнтральнай газеты Беларусі.

Аляксандр Фёдаравіч Мяснікоў (1886 — 1925). Рэдагаваў «Звязду» з 08.1917 па 05.1919. Загінуў у авіяцыйнай катастрофе над Тбілісі. Ёсць звесткі, што гэта была «спланаваная дзея» з боку яго патаемных праціўнікаў.

З архіўнай даведкі «Звязды» з 20.11.1917 г. па 18.02.1926 г. вынікае, што яе галоўныя стваральнікі аказаліся за межамі газеты: А.Ф. Мяснікоў — галоўнакамандуючы Заходняга фронту, старшыня СНК Аблвыкамзаха, К.І. Ландар — старшыня Аблвыкамзаха, рэдактар газеты «Советская правда». Абавязкі рэдактара «Звязды» фактычна выконваў загадчык аддзела «Агляд унутраных і замежных падзей» В.Г. Кнорын.

У архіве адсутнічаюць звесткі аб гібелі супрацоўнікаў «Звязды» на вогненных абшарах войнаў. Але цяжкасцяў хапала. У лютым 1918 года Мінск на нейкі час аказаўся без улады: «чырвоныя» хуценька пакідалі яго, а немцы асцярожна прасоўваліся да гарадскіх ускраін. Становішча ў нейкім сэнсе было вынікам палітыкі «ні міру, ні вайны», прапанаванай наркамам замежных спраў РСФСР Л.Д. Троцкім на перагаворах з германцамі ў Брэсце.

Карціну станаўлення беларускай дзяржаўнасці, яе тэрыторыі дапаўняюць лісты ўпаўнаважанага ЦК РКП(б) пры ЦК КП(б)Б А.А. Іофэ ў Мінску У.І. Леніну, Я.М. Свярдлову, Л.Д. Троцкаму, Г.В. Чычэрыну. Усяго намі адшукана ў архівах Масквы 6 такіх пасланняў. Яны датычацца скарачэння тэрыторыі Беларускай рэспублікі, яе аб'яднання з Літоўскай ССР, узаемаадносін паміж членамі ўрада Беларускай ССР.

Такім чынам, нягледзячы ні на што, тэрыторыя БССР была звужана да Мінскай і Гродзенскай губерняў. Урад аб'яднанай ЛітБел быў створаны. Але яго эфектыўнасць аказалася невысокай. Ён фактычна перастаў існаваць летам 1919 года (захоп палякамі Літвы і значнай часткі Беларусі, а юрыдычна — 31.07.1920 г., у выніку другога абвяшчэння Беларускай ССР). Лёс А.А. Іофэ аказаўся трагічным. 19 лістапада 1927 года «Звязда» надрукавала «Некралог на смерць А.А. Іофэ», у якім гаварылася: «*Масква. 17 лістапада, увечары, з прычыны нервовага расстройства, якое было выклікана цяжкай хваробай, што пачалася яшчэ ў 1922 г., стрэлам з рэвальвера пакончыў жыццё самагубствам былы ўдзельнік перагавораў у Бярэсці, першы паўнамоцны прадстаўнік у Нямеччыне, а пазней у Кітаі, а потым упаўнаважаны Савецкага ўрада ў перагаворах у Японіі, паўнамоцны прадстаўнік у Аўстрыі, у апошні час — намеснік старшыні Галоўканцэскаму А.А. Іофэ. Выказалі спачуванне блізкім нябожчыка, ураду СССР нямецкі пасол граф Брандорф-Рандаў, польскі пасланнік Патэк, літоўскі пасланнік Балтрушайціс і мангольскі паўнамоцны прадстаўнік Баян-Чуган*». Змяшчэнне гэтай інфармацыі ў «Звяздзе» можна разглядаць як факт праяўлення спачування з боку калектыву газеты.

Гісторыкі ў сваёй большасці лічаць выхад «Звязды» і пачаткам існавання выдавецтва «Звязда». Свае меркаванні яны падмацоўваюць наступным. Ужо ў лістападзе — снежні 1917 года намаганнямі звяздоўскіх журналістаў выдадзены болей чым 20 брашур, сярод якіх работы У.І. Леніна: «Урокі рэвалюцыі», «Зямельнае пытанне», «Як падманулі народ сацыялісты-рэвалюцыянеры і што даў народу новы ўрад бальшавікоў», «Палітычныя партыі ў Расіі і задачы пралетарыяту», «Руская рэвалюцыя і грамадзянская вайна» і інш.

Выдавецкая дзейнасць «Звязды» дапаўнялася аналагічнай работай іншых падобных установаў. Іх кнігі, часопісы, газеты на беларускай мове распаўсюджваліся ў Беларусі, Расіі, Германіі, Польшчы, Чэхіі. Асабліва добрых слоў заслугоўвае выдавецкі аддзел Беларускага нацыянальнага камісарыята, які ўваходзіў у Наркамнац РСФСР. У 1918 годзе ён выдаў на рускай і беларускай мовах курс «Белорусазнаўства» для чытання лекцый па гісторыі і культуры Беларусі. У гэты першы беларускі падручнік увайшлі працы У.І. Пічэты, А.Ф. Фартунатава, З.Ф. Жылуновіча, П.А. Растаргуева, М.А. Янчука і іншых знакамітых гісторыкаў, пісьменнікаў, этнографаў Беларусі.

Новую старонку ў выдавецкай і газетнай справе Беларусі адкрыла пастанова ЦВК БССР «Аб стварэнні Дзяржаўнага выдавецтва БССР і цэнтралізацыі друкарскай справы» (студзень 1921 г.). У адпаведнасці з ёю, пры Белдзяржвыдавецтве ўтварыўся аддзел перыядычнага друку, куды разам з іншымі ўвайшоў і прадстаўнік «Звязды». Дзяржвыдавецтва стала адной з найважнейшых дзяржаўных устаноў па забеспячэнні грамадства гістарычнай, культурна-асветніцкай, навуковай інфармацыяй.

З красавіка 1925 года сакратарыят ЦК КП(б)Б, разгледзеўшы гаспадарчую дзейнасць «Звязды», прызнаў, што газеце неабходна аказаць фінансавую дапамогу, але ўлічваючы цяжкасці пераходнага перыяду, пастанавіў вылучыць выдавецтва «Звязды» ў самастойную гаспадарчую адзінку.

У пачатку 20-х гадоў прымаліся палітычныя і гаспадарчыя меры па наладжванні ўзаемаадносін нацыянальных ускраін з Масквой, гістарычным цэнтрам былой Расійскай імперыі. Ад імя БССР подпіс пад Дагаворам і Дэкларацыяй аб утварэнні Саюза ССР паставіў 30 снежня 1922 года ў Маскве кіраўнік беларускай дэлегацыі, старшыня ЦВК і СНК БССР А.Р. Чарвякоў. У складзе прыбыўшых у Маскву ў той час знаходзіўся і рэдактар «Звязды» В.А. Нодэль.

Вітольд Францавіч Ашмарын (Ахрамовіч) (1882 — 1930). Рэдагаваў «Звязду» са жніўня 1920 па жнівень 1921. Скончыў жыццё самагубствам у Пятроўскім парку ў Маскве, не вытрымаўшы інтрыг у апараце ЦК ВКП(б).

Патрабуе дадатковага тлумачэння гісторыя двух з'ездаў, што адбыліся ў пачатку 20-х гадоў: трэцяга з'езда Кампартыі Беларусі (22—25 лістапада 1920 г.) і другога — Усебеларускага з'езда Саветаў (13—17 снежня 1920 г.). На першым з асноўным дакладам выступіў сакратар ЦК КП(б)Б В.Г. Кнорын. У пастанове па яго выступленні Беларусь ізноў называецца «часткаю РСФСР». У выніку другі Усебеларускі з'езд Саветаў не зацвердзіў паўнацэнную Канстытуцыю БССР, а толькі «Дапаўненні да Канстытуцыі», якія абмяжоўваліся цэнтральнымі органамі ўлады. Урад Беларусі не змог адстаяць і сваю тэрытарыяльную цэласнасць на Рыжскіх мірных перагаворах паміж РСФСР і Польшчай. Падрабязнасці падзей можна знайсці ў артыкуле В.Г. Кнорына «Мір і Беларусь» у «Звяздзе» ад 21.10.1920 года.

Сёлета, 8 сакавіка, споўнілася 125 гадоў з дня нараджэння А.Р. Чарвякова. Нагадаем яшчэ раз пра вялікую ролю гэтага дзяржаўнага дзеяча ў аднаўленні беларускай дзяржаўнасці пры пераходзе ад вайны да міру. Ён быў вымушаны напісаць пісьмо У.І. Леніну аб недаацэнцы мясцовымі ваеннымі дзеячамі нацыянальнай дзяржаўнасці для беларускага народа. Пісьмо было разгледжана і падтрымана. Аляксандр Рыгоравіч Чарвякоў з 1920 па 1937 год — старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Беларускай ССР. (Жыццё закончыў самагубствам у чэрвені 1937-га, не вытрымаўшы несправядлівых абвінавачванняў.)

Статус газеты «Звязда» ў той перыяд упершыню прыраўнялі да статусу адной з цэнтральных гістарычных крыніц па вывучэнні гісторыі Кастрычніцкага пераваротаў Беларусі.

Гэта адбылося ў 1932 годзе. Менавіта тады, у час падрыхтоўкі да 15-годдзя «Звязды», прагучаў зварот да газеты як да галоўнай гістарычнай крыніцы. Змяшчаўся ён на старонках Прадмовы — дакумента, які абвясціў аб пачатку перавыдання шэрагу нумароў «Звязды». У ім гаварылася: «Разглядаемае перавыданне («Звязды». — **Аўт.**) вельмі неабходна ў Беларусі, дзе багацейшая гісторыя Кампартыі Беларусі яшчэ чакае сваіх даследчыкаў-гісторыкаў, дзе іншыя віды гістарычнай дакументацыі, асабліва дакастрычніцкага перыяду і грамадзянскай вайны, поўнасцю або часткова знішчаны».

У перавыданне ішлі нумары «Звязды» ад 9 жніўня (27 ліпеня) да 13 снежня (30 лістапада) 1917 года. Рабілі газету ў той перыяд: члены рэдакцыі А. Мяснікоў, В. Кнорын, К. Ландэр, В. Фамін. У выданні «Звязды» і «Молата» ўдзельнічаў да свайго ад'езду ў Івана-Вазнясенск М. Фрунзэ (Міхайлаў — псеўданім). Загадчыкі аддзелаў: В. Неўскі (агляд друку і салдацкія пісьмы), В. Кнорын (унутраны і знешні агляд), Г. Усцінаў (фельетоны і інфармацыя), В. Рэзаўскі (мясцовае жыццё і выпускальнік).

Не дажылі да 15-годдзя «Звязды» А. Мяснікоў, М. Фрунзэ, В. Ашмарын. Усе пайшлі ў іншы свет заўчасна.

У дні святкавання 15-годдзя калектыў «Звязды» атрымаў віншаванне ад газеты «Рабочий», у якім гаварылася: «...15-гадовы юбілей «Звязды» супадае з пяцігадовым юбілеем пераводу яе на беларускую мову... Юбілей «Звязды» — гэта свята працоўных мас усёй БССР».

Яўген БАРАНОЎСКІ,
кандыдат гістарычных навук

■ Беларусам быць модна

Сукенка з сакрэтам, або Нацыянальны касцюм на новы лад

Напэўна, не знойдзеш лепшай рэчы-візітоўкі для краіны, чым вопратка. Не кожны замежны госць дабярэцца да прыгожых мясцін, музеяў ці нават сувенірных лавак. А хіба ж ён не кіне вока на нашых модніц, апранутых у нешта асаблівае? Сэлфі з прыгажунямі ў вышыванках, якія б замежнікі выкладалі ў сацыяльнах сетках, былі б добрай рэкламай Беларусі. Тым больш што беларускі арнамент — асаблівая старажытная шыфроўка, пасланне. Раней майстрыхі пры дапамозе яго расказвалі пра свае мары і лёс, прасілі аб дабрабыце і каханні. Людзі нават верылі, што вытканыя сімвалы могуць засцерагаць ад нягод ці прыносіць шчасце. І чаму б такую «фішку», якая нічым не горшая за кітайскія іерогліфы, нам не выкарыстоўваць для сваёй ідэнтыфікацыі. Ды і спадніцы нашых прабабуль былі з сакрэтам: па ўзорах на іх людзі маглі адрозніваць, з якіх вёсак паходзяць уладальніцы. Не, мы не заклікаем усіх адразу ўлазіць у нацыянальныя строі. А вось паказаць, што беларускія касцюмы могуць быць цікавымі, моднымі, стыльнымі, усё ж паспрабуем.

Маладога дызайнера Надзею Кузняцову якраз нацыянальны касцюм натхніў на стварэнне новай калекцыі. Дзяўчына спрабуе прадставіць беларускае адзенне такім, якім бы яно выдатна ўпісвалася ў сучаснае жыццё.

— Беларуская вопратка сёння — гэта не гістарычная рэканструкцыя, а хутчэй інтэрпрэтацыя, пошук таго, як яна магла б выглядаць у нашы дні, — дзеліцца дызайнер. — Каб зацікавіць моладзь, я вырашыла выкарыстаць стылізацыю. Хачу паказаць, што такое адзенне можна насіць з сучаснымі сумкамі, хадзіць у ім на вучобу, нават спалучаць з кедамі. Крой сучасных строяў ад традыцыйнага розніцца разнастайнасцю формаў і канструктыўных ліній, рашэннем тэхнікі апрацоўкі швоў, пакроем рукава. Сукенкі і спадніцы я аздобіла кішэнямі.

Хачу паказаць беларускі касцюм у нетрадыцыйных для яго колерах, адысці ад стандартнага чырвона-белага. Так, у маёй калекцыі будуць карычневыя і малочныя таны. Некалькі камплектаў я рашыла паспрабаваць падаць у кантрасным спалучэнні аранжавага і блакітнага, гэта як сонца і неба. Так, прырода — крыніца майго натхнення. А зараз вясна, з ёй быццам і людзі абуджаюцца, хочацца чараваць, дзяліцца ідэямі.

Між іншым, распрацоўваць беларускую тэму Надзея пачала, калі працавала над калекцыяй спартыўнай вопраткі. Дзяўчына заўважыла, што ў людзей з'явілася цікавасць да рэчаў з беларускай «прыкметай». Васьміканцовыя зоркі, валошкі і нават проста беларускія словы сёння выкарыстоўваюцца ў стварэнні брэндаў для новых тавараў і паслуг, у афармленні кавярняў і гатэляў. Але чаму попыт «на беларускае» не абуджаць і праз стварэнне адметнай вопраткі?

— Летась на беларускім тыдні моды прайшоў паказ пад лозунгам «Я люблю Беларусь». Маладыя дызайнеры рабілі калекцыі з элементамі гістарычнага нацыянальнага касцюма. Прыязджыя госці, якія ўдзельнічалі ў паказе, адразу праявілі цікавасць да такога адзення. Так, сёння можна ўжо знайсці ў крамах вырабы з нашай сімволікай, вышыванкі. Але гэтага, лічу, недастаткова. У мінулым годзе на дзень горада ні ў парку, ні ў цэнтры я не сустрэла людзей, якія былі б у адзенні з беларускай сімволікай. Нават калі ездзіла ў Дудуткі, не пабачыла там ні афіцыянтаў у нацыянальных касцюмах, ні прадаўцоў. Думаю, што на турыстычных аб'ектах мы павінны знаёміць гасцей таксама і з беларускім арнаментам, касцюмам.



— Сёння мы добра ведаем пра асаблівасці адзення розных краін. А што павінны ўлічыць дызайнеры пры стварэнні беларускай вопраткі?

— Па-першае, гэта натуральныя тканіны. У пашыве аўтэнтычнага адзення не выкарыстоўваецца сінтэтыка. Па-другое, крой. Беларуская вопратка закрытая, няма адкрытых плеч і каленяў, ніякай пошласці, празрыстых дэталяў, каб прасвечвалася бялізна. У сукенках — вузкі выраз гарлавіны, у некаторых мадэлях я выкарыстоўваю каўнер-стойку. Наша вопратка быццам падкрэслівае дзявочую сціпласць і тым дадае загадкавасці, выклікае інтарэс. Можна спалучаць традыцыйны крой з тым, што зараз модна. Напрыклад, чаму б сучасную сукенку не зрабіць з вялікім пакроем рукава? Спадніца з кішэнямі і поясам можа быць доўгай і пышнай, як у той час.

Далей — гэта разнастайнасць арнаменту, гэта нашы абярэгі. Яшчэ і цяпер можа бачыць, як людзі засцерагаюцца шпількамі ці чырвонымі ніткамі. Я бачу, што многія мае равеснікі цікавяцца значэннем арнаменту. А расказаць сапраўды ёсць што. Мне напрыклад, вельмі падабаюцца арнаменты з сімволікай кахання, а яны ёсць розныя — так, асобныя расказваюць пра пачатак пачуцця, другія — пра яго росквіт. Раней дзяўчаты рабілі такія вышыўкі на сваіх сукенках. Як бачыце, праз вопратку мы можам прыўносіць у свет інфармацыю і пра сваю культуру, традыцыі.

Калі Надзея на Тыдні моды ўдзельнічала ў паказе «Новыя Імёны», працавала з беларускім ільном. Ёй спадабалася структура матэрыялу, і яна смела з ім эксперыментуе, тым больш што сённяшні выбар тканін дазваляе рабіць касцюмы ў розных колерах.

— Я спрабую дэкаратыўныя льняныя тканіны, выкарыстоўваю нават мешкавіну ў стварэнні мадэляў, — дзеліцца Надзея. — Не абмяжоўваюся толькі рабочай адзеннем, сарафанамі, кашулямі, а раблю поўныя камплекты. Працую з беларускім сукном, шыю палітовыя вырабы, накідкі. Нават з арнаментам можна пачараваць. Так, у некаторых мадэлях ён традыцыйны — гэта вышыўка крыжыкам, а ў іншых — прынт ручной работы. Я паспрабавала і стылізацыю. Так, выразала арнамент з сукна: гэта тканіна не сыплецца, што дае магчымасць для эксперыментаў. Калі ручная вышыўка замяняецца на машынную, ці малюнак ствараецца акрылавымі фарбамі, гэта дазваляе рабіць рэчы больш таннымі. Пераважна мая калекцыя разлічана на моладзь, такая вопратка не павінна быць дарагой, каб студэнты маглі дазваляць сабе падобныя пакупкі са стыпендыі. Я ж бачу, што апошнім часам менш становіцца індывідуальных заказаў, больш людзі рамантуюць, аднаўляюць вопратку. Самы бюджэтны варыянт для тых, каму вельмі хочацца чагосьці беларускага, — зрабіць арнамент, напрыклад, на любімую баечку.

«У мінулым годзе на дзень горада ні ў парку, ні ў цэнтры я не сустрэла людзей, якія былі б у адзенні з беларускай сімволікай. Нават калі ездзіла ў Дудуткі, не пабачыла там ні афіцыянтаў у нацыянальных касцюмах, ні прадаўцоў».

— Твая самая першая калекцыя «Джынсавыя нябёсы», якая з поспехам вытрымала сем беларускіх паказаў, была створана для падлеткаў. Не плануеш яшчэ працаваць над адзеннем для дзяцей?

— Я нядаўна стала мамай. І, безумоўна, мне захацелася зрабіць для немаўляці кашулі з абярэгамі. У мяне столькі ідэй! Летась разам з Аляксандрам Варламавым мы ствараліі дзіцячыя калекцыі, і такі вопыт быў вельмі карысны. Сёння я працую над уласнай калекцыяй з беларускай сімволікай. Пяць пробных камплектаў для дзяўчатак я ўжо стварыла. Цяпер дапрацоўваюцца аксэсуары — сумачкі, галаўныя ўборы, накідкі. Таксама я прапаную для дзяўчатак стылізаваныя вяночкі, якімі можна аздобіць валасы. Павязкі з арнаментам можна выкарыстоўваць нават у камплектах са спартыўнай вопраткай. Таксама я прапаную стылізаваныя шапачкі. Пакуль дзіцячыя сукенкі, сарафаны я стварыла як адзенне для паўсядзённага выкарыстання, але, магчыма, трэба папрацаваць і над той вопраткай, якую можна насіць як школьную форму. І хоць я зараз у дэкрэце і пры гэтым яшчэ працягвую вучобу ў Інстытуце сучасных ведаў, не спыняюся, раблю фотасесіі сваіх калекцый, дэманструю, шукаю аднадумцаў, дзялюся сваёй творчасцю.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

dziadziula@zviazda.by

УЛАСНАЯ СКАРЫНІЯНА

Няма, напэўна, у Беларусі больш вядомай гістарычнай асобы, чым Францыск Скарына. Асабліва сёлета, калі рыхтуемся адзначаць 500-гадовы юбілей беларускай друкаванай кнігі, пра таго, хто гэту кнігу аддрукаваў, пішацца і гаворыцца вельмі шмат. Яно так і павінна быць, бо Скарына — наш бясспрэчны нацыянальны герой, не ведаць пра якога проста немагчыма.

Але ці сапраўды мы ведаем пра нашага першадрукара шмат? Калі хочаце праверыць гэта, запрашаем вас стаць удзельнікам віктарыны «Мая Скарыніяна», якую «Звязда» ладзіць сумесна з Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі. Віктарына будзе праходзіць у тры туры, па дзесяць пытанняў у кожным. Дзевяць з іх з варыянтамі, сярод якіх адзін правільны. Прыдумваем мы іх, кансультуючыся з намеснікам дырэктара бібліятэкі па навуковай рабоце, вядомым даследчыкам спадчыны Скарыны Алесем Сушам. Дзясятае ж пытанне, якое патрабуе канкрэтнага адказу, прапануе ад Нацыянальнай бібліятэкі сам спадар Алесь.

Адразу хочам папярэдзіць: не ўсе адказы вы здолееце знайсці ў сеціве (але некаторыя ў публікацыях «Звязды» — дакладна). Не ўсе пытанні простыя, як здаецца на першы погляд. Але ж і чытачы ў нашай газеты — дапытлівыя і дасведчаныя, таму мы ўпэўненыя, што вы з пастаўленай задачай справіцеся. Тым больш, што колькасць удзельнікаў неабмежаваная: адказваць на пытанні можна ўсёй сям'ёй ці цэлым класам.

Вынікі будуць падводзіцца пасля кожнага тура, тады ж будуць друкавацца і правільныя адказы на пытанні. Вашы адказы прымаюцца на працягу месяца пасля апублікавання задання тура.

Пераможцаў віктарыны чакае выдатны прыз — бясплатная экскурсія па Нацыянальнай бібліятэцы акурат у дні, калі краіна будзе святкаваць 500-годдзе беларускага кнігадрукавання.

Адказы на пытанні можна дасылаць на паштовы адрас рэдакцыі: вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, Мінск (з пазнакай «Скарыніяна») або на e-mail:skaryna@zviazda.by.

Пачніце ствараць уласную Скарыніяну — убачыце, як гэта цікава. У добры шлях!

ПЫТАННІ ПЕРШАГА ТУРА ВІКТАРЫНЫ «МАЯ СКАРЫНІЯНА»

1. ***Кім па родзе заняткаў быў бацька Францыска Скарыны Лука?***

- ❍ Разьбяром
- ❍ Святаром
- ❍ Купцом
- ❍ Кавалём

2. ***У Полацку нядаўна археолагі знайшлі рэшткі будынка, які меркавана звязаны з іменем Скарыны (цяпер ён знаходзіцца на тэрыторыі прысядзібнага ўчастка аднаго з палачан). Што, як лічаць гісторыкі, там месцілася ў часы Скарыны?***

- ❍ Адзін з дамоў купецкага пасада, дзе мог нарадзіцца будучы першадрукар
- ❍ Храм, у якім хрысцілі Францыска
- ❍ Бернардзінскі кляштар, у якім Скарына мог атрымаць першапачатковую адукацыю
- ❍ Брацкая школа, дзе выкладаў славуты Сімяон Полацкі

3. ***Абярыце найбольш рэальны маршрут перамяшчэння Францыска Скарыны па гарадах Еўропы ў храналагічным парадку:***

- ❍ Полацк — Кракаў — Падуя — Прага — Вільня — Масква
- ❍ Полацк — Вільня — Масква — Кракаў — Прага — Падуя
- ❍ Полацк — Масква — Кракаў — Вільня — Падуя — Прага
- ❍ Полацк — Прага — Кракаў — Падуя — Масква — Вільня

4. ***Як называлася першая кніга Скарыны, якая пабачыла свет у 1517 годзе?***

- ❍ «Псалтыр»
- ❍ «Апостал»
- ❍ «Малая падарожная кніжка»
- ❍ «Кніга Царстваў»

5. ***Устаўце прапушчанае бібліейскае імя ў славутай скарынаўскай прадмове: «Таму і ??? , любячы край, дзе калісьці на свет нарадзілася, не шкадавала самое сябе, каб адвесці ад краю айчыннага небяспеку...»***

- ❍ Ева
- ❍ Юдзіф
- ❍ Руф
- ❍ Царыца Саўская

6. ***Хто з беларусаў упершыню згадаў імя Скарыны ў газеце «Наша ніва» ў пачатку XX стагоддзя?***

- ❍ Янка Купала
- ❍ Сяргей Палуян
- ❍ Максім Багдановіч
- ❍ Вацлаў Ластоўскі

7. ***Як было прозвішча прыватнага ленінградскага калекцыянера, у якога ў 1925 годзе былі набытыя першыя асобнікі скарынавых кніг для Беларускай дзяржаўнай бібліятэкі?***

- ❍ Мысліцкі
- ❍ Бранявіцкі
- ❍ Камарніцкі
- ❍ Ляшчынскі

8. ***Як у Мінску называецца вуліца, якая з 1967 па 1989 год насіла імя Францыска Скарыны?***

- ❍ Алешава
- ❍ Праспект Незалежнасці
- ❍ Кальварыйская
- ❍ Акадэмічная

9. ***Калі сёлета дакладная дата 500-годдзя беларускага кнігадрукавання?***

- ❍ 6 жніўня
- ❍ 9 жніўня
- ❍ 6 верасня
- ❍ 19 верасня

10. **Пытанне ад Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.** ***Як звалі жонку Францыска Скарыны?***

Хадзем у горы!

«Стаў на ляднік — і панік», — цытуе песню Высоцкага Васіль Еўсікаў. Сёння гродзенец упершыню адкрые сакрэты пакарэння гор Кіліманджара і Эльбрус. Голая праўда пра страх, сяброўства, дабрыню, каханне і здраду на вышыні 6 тысяч метраў над узроўнем мора. Васіль не ўтоіць нічога, раскажа пра няпростыя моманты, пра тое, аб чым звычайна маўчаць.

Пацалунак скалы, шыпучыя горныя рэкі, зламаная нага, спыненне дыхання, мокрыя спальнікі на марозе — і гэта толькі пачатак. Як горы зрываюць маскі? Чаму людзі рызыкуюць жыццём дзеля мэты, якую каля падножжа бачаць вар'яцкай? Калі горнае паветра змывае праблемы, хлусню? Што адчуваеш на вяршыні і каго клічаш у сне?

ЗАБІЦЬ МАМАНТА

Эльбрус — самая высокая вяршыня Еўропы, Кіліманджара — Афрыкі. Гэта 5895 метраў над узроўнем мора ў другім выпадку і крышку менш у першым. Штурмаваць гару едуць не прафесійныя альпіністы, а падобныя да нас з вамі людзі. Боязь вядзе рэй ужо каля падножжа. «Дзе наш гатэль?» — пытаюць за спінай. Мёртвая цішыня, дзікі снежны пейзаж — і вочы ў многіх вялікія. «Не, хлопцы, бывайце здаровы, а я еду дадому-дахаты». З першага дня горы адправілі «рыцараў» і панты назад, у цывілізацыю.

«Па-першае, я паехаў на Эльбрус, каб знайсці сяброў, — кажа Васіль Еўсікаў. — Каштоўнасці моладзі нярэдка ўпіраюцца ў айфоны, інстаграм. Людзі выкладваюць фота з начных клубаў. Для мяне гэта тое ж, што паход у гіпермаркет дзеля сэлфі з каўбасой. Крутасці тут не бачу. Вось і захацелася знайсці тых, хто ведае смак сапраўднага жыцця. Па-другое, прырода стварыла мужчыну, каб ён, умоўна кажучы, «паляваў», а не сядзеў за камп'ютарам. Бег, рызыка. Разумееце? І хоць сёння кусок мяса дае работа ў офісе, у глыбіні мужчыны дрэмле адрэналін».

«Забіць маманта?» — пытаю.

«Так!» — усміхаецца Васіль.

КАШМАРЫ НА ЭЛЬБРУСЕ

«На Эльбрусе мы не ведалі, што нас чакае. Праз метр «падбадзёрвалі» мемарыяльныя таблічкі, — дзеліцца альпініст. — Быў першы, а таму самы лёгкі дзень. Думаю: «Як можна было загінуць тут?» Азіраюся: вось гара, сцежка, а далей — рэзкі спуск і шыпіць горная рэчка. Аступішся — і звалішся ў ваду. Лёс вырашыць спадарыня ўдача: знойдзецца на тваю галаву камень ці не? Значыць, за 10 дзён загінуць можна ў любы момант».

«Я гавару пра сябе. Можа камусьці было лёгка. Калі ў апошні дзень інструктар сказаў, што далей кожны ідзе сваім тэмпам, адзін хлопец пайшоў вельмі хутка, яго праз паўгадзіны не было відаць. Важна правільна абраць таварыша, не ныціка, не жвавага лася, а сваю роўню», — лічыць Васіль Еўсікаў, і сяброў ён знайшоў. Чым вышэй падымаліся, тым выразней было бачна: хто ёсць хто? Горы зрывалі з вачэй шоры, разбівалі на друзачкі маскі, агалялі душы. Першабытнае паветра ачышчала арганізм ад хлусні. І кожны знаходзіў тых, хто мог дапамагчы, падтрымаць, натхніць, супакоіць, падпітаць баявы дух.

«На Эльбрусе быў момант, і я знянацку зразумеў Высоцкага: «Стаў на ляднік і панік», — цытуе песню наш герой. — Здаецца, вось яшчэ ішоў па снезе. Тут ступіў на лёд. Усё! А пад вяршыняй чакаюць 62 градусы нахілу. Адчуванне слізоты пад сняжком рве нітачку дзесьці ў жываце. Вельмі многія далей не пайшлі».

Поруч падымаюцца муж з жонкай, яна млее на вачах. Інструктар кажа: «Ёй дрэнна. Ідзіце ўніз!» Муж: «Я занадта шмат прайшоў, каб спыніцца». І ён адпраўляе жонку ўніз адну ў кепскім стане ноччу ў дваццаціградусны мароз, калі нельга адпачыць, бо замерзнеш. Скалы Эльбруса славяцца расколінамі. Чым яны жудасныя? Упаў з вышыні — мігам разбіўся. Калі ж патрапляеш у расколіну, марудна паміраеш пад зямлёй ад пераахаладжэння ці смагі. Для тых, хто ідзе ў кампаніі, няма прычыны баяцца, бо іншыя паклічуць дапамогу. У адзіночніка шанцаў няма.

«Пачынаецца буран, цямнее, нулявая бачнасць. Сонца за чорнымі хмарамі. Мой таварыш знімае балаклаву (спецыяльная маска для альпінізму. — **Рэд.**), але нават цяпер промні апякаюць скуру, як гарачая духоўка», — здзіўляе Васіль Еўсікаў. Горная хвароба бярэ сваё. З палатак не выходзяць, а выпаўзаюць. Ноччу прачынаешся, бо 15 секунд не дыхаў, а пасля рэзка глытаеш паветра з падвоенай сілай. Гэты сімптом называюць «дыханнем Чэйна-Стокса». На вышыні арганізму мала кісларoду. Мозг працуе горш і горш, адключаецца маўленне. Але чым фізічна цяжэй, тым лягчэй псіхалагічна. Знікаюць думкі, праблемы. І вось ён, момант, калі мэта ясная. Яна адна, і няма перашкод, працягні руку.

Перад штурмам вяршыні Эльбруса ад Васіля не адстаюць два браты. Снег прыцерушыў лёд. Мужчыны ідуць у кошках (металічныя прыстасаванні для альпінізму, прымацоўваюцца да чаравікаў. — **Рэд.**). Яны ўгрызаюцца ў лёд і так ступаюць па слізоце. Адзін з братоў няўдала ставіць нагу, падае спінай на лёд і разганяецца ўніз. Камень! Зламаная нага. Дзякуй, што не шыя. Пад крык болю брат гаворыць брату: «Я занадта шмат прайшоў». І штурмуе Эльбрус адзін.

«Аднойчы я прачнуўся, бо мужчына ў сне клікаў маму. Па скуры пабеглі дрыжыкі, падумаў: можа, і я таксама клічу ўначы, проста мне ніхто пра гэта не гаворыць? Але страх уласнай смерці не можа спыніць. Цяпер лічу такое імкненне вар'яцтвам, — прызнаецца Васіль Еўсікаў. — А ў гарах быў толькі я і мая вяршыня».

І вось ён, пік Эльбруса. Эйфарыі няма, адна нечалавечая стомленасць. Радасць прыйдзе пасля, з кожным крокам уніз, а разам з ёй задаволенасць сабой, сваім жыццём і ўпэўненасць, што на ўзроўні мора ты цяпер зможаш усё.

ПАЦАЛУНКІ НА КІЛІМАНДЖАРА

Кілі, як называе Васіль Еўсікаў Кіліманджара, — залатая жыла Танзаніі. Цана пакарэння гары — 3—5 тысяч долараў. Таму ў кнізе водгукаў найчасцей сустракаюцца англічане, амерыканцы, шведы. Па фінансах б'е экіпіроўка: ужо згаданая балаклава, трэкінгавыя палкі, тэрмабялізна, воданепранікальныя курткі, нагавіцы з мембранай для адвядзення пары ад цела, каб не адчуваць спёку, як у лазні. Апрача гэтых адмысловых рэчаў і платы інструктару, наймаць па 2—3 насільшчыкі на чалавека прымушае закон, бо народ жыве аднымі бананамі. Каб стварыць больш працоўных месцаў, насільшчыкі і інструктары — толькі з мясцовых. «Мы панясём усё сваё самі». «Добра, нясіце самі, але насільшчыкам плаціце!»

Кіліманджара як ніякая іншая афрыканская гара багатая на рэкорды. Так, самаму маленькаму пакарыцелю было 7 гадоў. Рэкорд самага старога альпініста спрабуюць біць штогод, пакуль ён належыць 87-гадоваму французу. Таму бабулі 80+ на марсіянскіх пейзажах Кілі — гэта не рэдкасць.

«Значыць, і дзядзька з суседняга пад'езда можа дайсці?» — пытаю.

«Як казаў інструктар, далёка не ўсе вельмі накачаныя людзі даходзяць. Груз мышцаў патрабуе многа кісларoду, з якім у гарах дэфіцыт. Таму спартсменам, калі яны не прафесійныя альпіністы, яшчэ цяжэй. Даходзяць курыльшчыкі і худыя, — смяецца Васіль. — Арганізм курыльшчыка і так звык да кісларoднага галадання, а ў худых мала мышцаў. Добра адаптуюцца дзяўчаты».

Тры разы на тыдзень Васіль бегае па 10 кіламетраў, і яму няцяжка, на вышыні больш за 4 тысячы метраў і 10 крокаў — гэта подзвіг, асабліва на Скале пацалункаў. Афрыканскія горы славяцца ўчасткам, дзе трэба пераступіць цераз бездань. Прыстаўным крокам, прыціснуўшыся тварам да скалы, ступаеш цераз прорву. Ззаду прорва і толькі наперадзе — скала, таму кожны максімальна прыціскаецца да яе і трэ сваім целам, значыць, цалуе. Рамантыкі дадаюць экватарыяльныя дажджы ў лістападзе. «Аднойчы лівень ішоў 5 гадзін, — успамінае альпініст. — Караскаешся па скале, з якой цякуць ручаі, кладзеш рукі на выступ, вада льецца ў рукавы. Сушыцца няма як, на вышыні вогнішча развесці нельга. Спім у мокрым, лёгкі мароз».

Хутка штурм вяршыні Кіліманджара. Група ідзе тэмпам самага слабага. Пачатак штурму заўжды ноччу, яшчэ крок, апошні рывок! Вось яна, Афрыка на далоні. Васіль Еўсікаў запомніць світанак на Кіліманджара на ўсё жыццё, праўда? Беларуса чакае самая высокая вяршыня Аўстраліі, і называецца яна — гара Касцюшкі.

Маргарыта САДОЎСКАЯ.

Эльбрус.

Кіліманджара.

Яўгена ПЯСЕЦКАГА
ФОТА СЛОВА

Той, хто вясновымі днямі завітае на маляўнічы бераг Прыпяці бліз старажытнага Турава, пераканаецца: такога звонкагалосага птушынага царства не ўбачыш нідзе. Нездарма сюды ў такі час прыязджаюць навукоўцы-арнітолагі назіраць за мноствам рэдкіх птушак. Адной з іх, куліку-марадунцы, занесенаму ў Чырвоную кнігу, у цэнтры Турава ўсталяваны помнік.



Я чуў птушыныя размовы,
Дзе Прыпяць ў вечнасць хвалі каціць:
У хоры радасным, вясновым
Кулік сваё балотца хваліць.

Узносяць птахі вырай цёплы,
Дзівосы райскія чужыны.
А ён — сваё: пра родны поплаў
Ды першацветы ўкруг альшыны.

Ах, каб вы бачылі той поплаў!
Там кветкі — нібы зоркі ў марах.
Яны, як падарунак Богаў
Бясконцым прыпяцкім абшарам.

Там птушкі водзяць карагоды
На лугавіне абагрэтай...
Спявай, кулік, пра поплаў родны
І я удвух з табой — дуэтам!

Белинвестбанк

РЕЗУЛЬТАТЫ РОЗЫГРЫША
РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

«КУПИ КАРТУ VISA И ВЫИГРАЙ БИЛЕТЫ НА ЕВРОВИДЕНИЕ 2017!»

Организатором Рекламной игры является Открытое акционерное общество «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк» (далее – Организатор), зарегистрированное постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 30.08.2001 № 232 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 807000028. Организатору выдана лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь от 03.06.2013 № 3. **Юридический адрес:** Республика Беларусь, 220002, г. Минск, пр-т Машерова, 29, тел. (37517) 239-02-39, УНП 807000028.

Наименование Рекламной игры: «Купи карту Visa и выиграй билеты на Евровидение 2017!»

Срок начала и окончания Рекламной игры: Рекламная игра проводится (включая срок выдачи выигрышей и опубликования результатов проведения Рекламной игры) в период с 6 апреля 2017 г. по 11 мая 2017 г.

Место (территория) проведения Рекламной игры: Республика Беларусь.

Сведения о государственной регистрации Рекламной игры: Свидетельство о государственной регистрации Рекламной игры №2964 от 04.04.2017 г. выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

Количество участников Рекламной игры: 598 человек.

Призовой фонд разыгран в полном объеме.

ПРИЗ	ФИО ПОБЕДИТЕЛЯ
Один комплект, состоящий из двух билетов на полуфинал Евровидения-2017 в г. Киеве, который состоится 11.05.2017 г., стоимостью 1626,08 (одна тысяча шестьсот двадцать шесть) белорусских рублей 8 копеек + денежный приз в размере 226,39 (двести двадцать шесть) белорусских рублей 39 копеек	Бабкин Владимир Анатольевич

Информацию об условиях проведения Рекламной игры можно получить по телефону Контакт-центра: 146 (+375 17 239 0 239) круглосуточно, а также на корпоративном сайте Организатора www.belinvestbank.by

УНП 101180535

ПРЕДЛОЖЕНИЕ О ПОКУПКЕ АКЦИЙ

ОАО «НОВОЕ СТЕКЛО»

Полное наименование и место нахождения, контактный телефон покупателя акций	Открытое акционерное общество «Новое стекло», 220035, г. Минск, ул. Тимирязева, 67, кабинет 190 (13-й этаж, кабинет 1317), тел. +375 29 610-02-58
Полное наименование, место нахождения профессионального участника рынка ценных бумаг, регистрирующего сделки купли-продажи	Открытое акционерное общество «Белинвестбанк» 220002, пр-т Машерова, 29, ком. 706, тел. 239-01-86
Полное наименование и место нахождение эмитента, акции которого покупаются	Открытое акционерное общество «Новое стекло», 220035, г. Минск, ул. Тимирязева, 67, кабинет 190 (13-й этаж, кабинет 1317), телефон +375 29 610-02-58
Цель приобретения акций	Сокращение их общего количества и уменьшение уставного фонда
Количество акций, которое намеревается приобрести Покупатель	335 (триста тридцать пять) простых (обыкновенных) акций
Цена приобретения акций, установленная общим собранием акционеров	94,34 (девяносто четыре рубля 34 копейки) за одну простую (обыкновенную) акцию
Сроки, форма и порядок оплаты акций	Оплата производится в течение 60 (шестидесяти) банковских дней с момента регистрации договоров купли-продажи у профессионального участника рынка ценных бумаг, путем перечисления денежных средств на лицевые или карт-счета акционеров
Место заключения договоров купли-продажи акций	ОАО «Белинвестбанк» 220002, пр-т Машерова, 29, ком. 706, тел. 239-01-86. Сделки по приобретению акций будут осуществляться на неорганизованном рынке, путем заключения договоров купли-продажи акций и регистрации их у профессионального участника рынка ценных бумаг
Дата начала и окончания срока представления предложений акционеров на продажу акций	С 2 мая 2017 года по 31 мая 2017 года
Дата начала и окончания покупки акций (заключения договоров купли-продажи)	С 1 июня 2017 года по 1 сентября 2017 года

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже линии по восстановлению автошин, принадлежащей ООО «Белретред» на праве собственности

Лот №1	Линия для изготовления и раскроя металлокорда и сборки покрышек	Начальная цена с НДС, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона, %
		100 000,00	5 000,00	5

1. Автоклав для наварки шин (в т.ч.: автоклав-основа, емкость для охлаждения жидкости) 1989 г.в. 2. Распылитель Airless 1997 г.в. 3. Ручной экструдер 1989 г.в. 4. Ручной шлифовальный прибор 1997 г.в. 5. Центр поглощения пыли Циклон ЦН-11-300 год выпуска – не установлен. 6. Инспекционная распорка 1997 г.в. 7. Станок для нанесения протектора шин 1992 г.в. 8. Станок для шерохования 1989 г.в. 9. Рессивер 5000 л 1992 г.в. 10. Кран-укосины – 3 шт. 1997 г.в. 11. Компрессор Boge S24 2001 г.в. Страна-производитель: Франция. 12. Осушитель POLAIR HIRROSS 1997 г.в. 13. Стеллаж для хранения внешних энвелопов 1997 г.в. 14. Шкаф для хранения внутренних энвелопов 1997 г.в. 15. Складские кассеты – 73 шт. 1997 г.в. 16. Стол с опрокидывающим механизмом 1997 г.в. 17. Пневмостеплер Prebena. Страна-производитель: Германия. 1997 г.в. 18. Ремонтная распорка с инструментальной бабкой 1997 г.п. 19. Облицовочный стол для резки протектора. Страна-производитель: Германия. 1992 г.в. 20. Резальная машина (резка прокладочной резины) 1997 г.в. 21. Установка для монтажа/демонтажа внешних оболочек 1997 г.в. 22. Монорельс. Страна-производитель: Германия. 1997 г.в. 23. Производственная линия и линия рационализации. Страна-производитель: Германия T.Joosten. 1997 г.в.

Местонахожжение предмета торгов: г. Минск, ул. Бабушкина, 48

УСЛОВИЯ

Победителем аукциона признается лицо, предложившее наиболее высокую цену.

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), – Претендент на покупку должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона после предъявления копий документов, подтверждающих возмещение затрат на организацию и проведение аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен оплатить стоимость, приобретенного на аукционе Объекта в течение 5 (пяти) банковских дней с назначенной даты проведения аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение повторного открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 5 (пяти) банковских дней с назначенной даты проведения аукциона.

При заключении договора купли-продажи в обязательствах Победителя аукциона (Претендента на покупку) будут включены требования по демонтажу, погрузке и вывозу Объекта за счет сил и средств Победителя аукциона (Претендента на покупку).

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

Аукцион состоится 22.05.2017 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4

Продавец: ООО «Белретред» **Ликвидатор:** Частное предприятие по оказанию услуг «ПАКУМ» 2200005 г. Минск, ул. Смолячкова, 9, оф. 426, тел. 8 (029) 332-19-36.

Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки» 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, 8 (017) 306-00-57.

Порядок оформления участия в аукционе и перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах, содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.

Задаток перечисляется по 18.05.2017 г. на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества ООО «Белретред» (Лот №1), проводимом 22 мая 2017 г. Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 06.05.2017 г. в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 6. Окончание приема заявлений 18.05.2017 в 11.00.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом аукциона. Контактное лицо для осмотра Объекта: Тимофеев Юрий Константинович, тел. 8 (029) 332-19-36.

Организатор торгов вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты его проведения.

Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Положения о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденного Постановлением Совета Министров Республики Беларусь 08.01.2013 № 16 и Положения об организации и проведении аукционов.

Первое извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 13.01.2017. Более подробную информацию можно получить у Организатора аукциона

☎ Организатор аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: mailto:**torgi@ino.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

УНП 300078307
УНП 300077196
УНП 300085631

по продаже в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

Дата, время, место проведения аукциона	7 июня 2017 г. в 10.00 в здании Поставского райисполкома (г. Поставы, пл. Ленина, 25, 4-й этаж, малый зал)						
Адреса, площади, кадастровые номера земельных участков, начальная цена	**№ лот**	**Адреса участков**	**Площадь, га**	**Кадастровый номер**	**Наличие ограничений в использовании**	**Начальная цена, руб.**	**Сумма подлежащих возмещению организатору аукциона расходов на его проведение**
	1	**Волковский сельисполком** Витебская обл., Поставский р-н, д. Кривое-2, ул. Центральная, 7А	0,1762	224080809601000035	Расположение на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранной зоне реки, водоема), – оз. Кривое и в охранных зонах электрических сетей напряжением до 1000 В	2000,00	1 951,07
	2	**Лынтупский сельисполком** Витебская обл., Поставский р-н, д. Пешковцы, ул. Тихая, д. 19А	0,2500	224082818101000045	Расположение на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранной зоне реки, водоема), – ручей №8	1500,00	1 222,90
	3	**Юньковский сельисполком** Витебская обл., Поставский р-он, д. Деревянки, ул. Центральная, д. 2Б	0,2007	224084907701000021	Расположение на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранной зоне реки, водоема), – оз. Должа	4000,00	1 835,70
	4	**Юньковский сельисполком** Витебская обл., Поставский р-он, д. Деревянки, ул. Центральная, д. 5А	0,2000	224084907701000020	Расположение на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранной зоне реки, водоема), – оз. Должа и в охранных зонах электрических сетей напряжением свыше 1000 В	4000,00	1 886,14
Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельных участков для проведения аукциона	- в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола аукциона внести плату за земельный участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с их изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для их проведения, формирования земельных участков, в т.ч. государственной регистрации; - в течение двух месяцев со дня утверждения протокола аукциона в установленном порядке обратиться за государственной регистрацией прав, ограничений прав на земельный участок; - получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство одноквартирного жилого дома; - приступить к занятию земельного участка в течение года со дня государственной регистрации земельного участка, возникновения права на него в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство)						
Порядок осмотра на местности земельного участка	В рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по мере обращений лиц, заинтересованных в участии в аукционе. Обращаться в землеустроительную службу Поставского райисполкома: г. Поставы, пл. Ленина, 25, 1-й этаж, каб. 11						
Перечень документов, которые необходимо представить участникам аукциона до его начала	- заявление на участие в аукционе (бланк можно получить и заполнить непосредственно в землеустроительной службе); - квитанция об уплате задатка; - ксерокопия стр. 25, 31, 32, 33 общегражданского паспорта без нотариального засвидетельствования; - представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность						
Место, дата и время начала и окончания приема заявлений	г. Поставы, пл. Ленина, 25, здание Поставского райисполкома, 1-й этаж, каб. 11 в рабочие дни с 8.00 до 17.00 со дня публикации извещения до 2 июня 2017 г. включительно						
Размер задатка, срок и порядок его внесения	10% от начальной цены соответствующего участка до подачи заявления на счет соответствующего сельисполкома. Реквизиты платежа указаны в бланке заявления на участие в аукционе						
